


*Двухмоўе* ☞ 3


# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**


*АНТОН МІРАНОВІЧ* ☞ 9



**http://niva.iig.pl**
**redakcja@niva.iig.pl**

**№ 22 (2559) Год L** | **Беласток, 29 мая 2005 г.** | **Цана 2,00 зл.**

*Паводле апошніх звестак, на будучы навучальны год у прадшколле запісалася ўжо 56 дашкольнікаў. Прытым беларускую мову вывучаюць не адно малечы, а бывае таксама — іх бацькі...*

# Нашы дзеці ў СМІ

**Ці нешта лепшае можа сустрэць у жыцці чалавека чым дзіця? Як маці і рэдактар „Зоркі" скажу адно: не!**

**Дрыжыкі па спіне прабягаюць, калі гляджу на нашы адміраючыя вёскі і чамусьці дарэмна шукаю там дзіцячага гоману, той мітусні ды адкрытасці, якую наводзяць дзеці. А калі і сустрэнеш апошніх з магікан — амаль усе яны польскамоўныя.**

Папраўдзе, часцей як у жыцці, беларускамоўнае дзіця зараз я сустракаю ў масмедыях! Так — у тэлебачанні, на радыё, у прэсе. І не ідзе тут выключна пра запіс актуальных падзей. Проста дзіцячая тэматыка — мёд на наша сэрца. Напэўна — гэта форма псіхічнай кампенсацыі, абарона нармальнасці.

З цікаўнасцю сачу за ўсімі беларускамоўнымі артыкуламі ў прэсе ды радыё- і тэлеперадачамі. Вось, асабліва ў пасляпвелікодны перыяд, калі адбываюцца конкурсы, турніры, алімпіяды, беларускамоўным журналістам сапраўдные жыва. Самай значнай падзеяй апошніх несумненна з'яўляецца дэкламатарскі конкурс „Роднае слова". Мерапрыемства пачынаецца са школьнага этапу, пасля раённы агляд і далей цэнтральны! Агулам удзельнічае ў ім звыш паўтысячы дзяцей. Не меншы заkalот і зрух вакол агляду беларускай песні. Сёлета ў Бельску выступіла пад пяцьдзесят выканаўцаў — у тым ліку калектывы і хоры. Падзея прынамсі на працягу тыдня ажывае на хвалях Радыё Беласток.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*У Гайнаўцы, Бельску і Нарве — усюды, дзе жывуць беларусы, варта адкрываць беларускія садкі і з наймалодшых гадоў пачынаць адукацыю на роднай мове...*

Усё больш паклоннікаў мае конкурс „Беларуская гавэнда". У некаторых выпадках дзеці выступаюць на ім з творамі на гутарковай мове. Больш элітарны і адборны быў сёлета Агляд тэатральных форм, дзе паказаліся дзевяць груп з чатырох мясцовасцей: Беластока, Чыжоў, Рыбалаў і Гайнаўкі. Працягваецца літаратурны конкурс (працы дасылаць да канца ліпеня). У нас трынаццаць лаўрэатаў у прадметным конкурсе беларускай мовы (маю на ўвазе толькі пачатковыя школы і гімназіі). Праўда, апошнія мерапрыемствы прызначаны для выдатнікаў і талентаў, аднак і тут ёсць пробліскі.

Здавалася б, што ўсе пералічаныя мерапрыемствы — гэта доказ нашай сілы, магчымасцей. Аднак рэчаіснасць выглядае трагічна. Глыбінка, заварожаная фанатычна-польскім Беластокам, асімілюецца ў маланкавым тэмпе. Праўда, тут і нашы шанцы на існаванне. Беларускамоўных дзяцей (у наяўнасці) найчасцей сустракаю ў Беластоку (сёлета яны першыя і ва ўсіх пералічаных конкурсах!). Самай сімпатычнай і тэрапеўтычнай справай тут — Самаўрадавае беларускае прадшколле і школы, у якіх вядзецца навучанне роднай мовы. Паводле апошніх звестак, на будучы навучальны год у прадшколле запісалася ўжо 56 дашкольнікаў. Прытым беларускую мову вывучаюць не адно малечы, а бывае таксама — іх бацькі. Ужо чарговы раз я глядзела этнапастаноўку „Вяселле". Вядома, уразілі мяне дзеці, асабліва народнымі танцамі. Аднак і бацькі таксама. Мне нават смешна, калі гарадскія прадпрымальнікі, настаўнікі, юрысты пераапранаюцца за сялян і з імпэтам спяваюць вясковыя песні з Катлоўкі, Пасынак, Ляхоў...

Таму ў Гайнаўцы, Бельску і Нарве — усюды, дзе жывуць беларусы, варта адкрываць беларускія садкі і з наймалодшых гадоў пачынаць адукацыю на роднай мове.

Як прыгожа і надзейна выглядаюць нашы дзеці на беларускай сцэне — бачым у СМІ. Там жывем яшчэ на ўсе грудзі, значыць — ва ўсіх пакаленнях.

**Ганна Кандрацюк**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

## *Ліка ці Анжаліка* ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Зараз, узяўшы прозвішча мужа, Анжаліка Агурбаш паспрабавала дасягнуць поспеху на еўрапейскай пляцоўцы па-англійску. Прыкладам, прадстаўніку Харватыі яго родная мова не перашкодзіла патрапіць у фінал. Анжаліка не патрапіла. Беларускі тэлевядучы, разам з усімі тэлегледачамі Беларусі перажмаўся гэтым фактам, пытаўся што мы не так зрабілі. А адказ просты...*

## *Жэст* ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

*Перад маскоўскім самітам над Польшчу насунуліся палітычныя цыклоны і антыцыклоны, тузаючы нашага Аляксандра за рукавы і полы то туды, то сюды: ехаць — не ехаць. Найшумнейшыя былі тыя парывы, якімі кіравалі не толькі згаданыя раней умоўныя рэфлексы, але і ваенны вопыт вынесены з выгаднага тэленазірання за прыгодамі чатырох танкістаў і сабакі...*



## *20 гадоў «Przeglądu»* ☞ 5

*Ала Матрэнчык: Праца над запускам газеты доўжылася некалькі месяцаў, бо між нас не было нікога, хто раней займаўся рэдакцыйнай працай. Я была ў Свята-Мікалаеўскім саборы, калі бацюшка запрапанаваў вернікам наш першы нумар. Сябра сказаў мне: „Разыходзіцца, як цёплыя булачкі!" Неўзабаве пахваліла і Ада Чачуга з „Нівы": „Удалося вам цалкам прыстойна!" Такі прыём нашай працы адухаўляў нас...*

## *Дзеткі спяваюць* ☞ 8

Аляксей Мароз

*У XXXII выпуску конкурсу „Беларуская песня", арганізаванага для вучняў падставовых школ і гімназій, які 13 мая праходзіў у Бельскім доме культуры, выступіла каля пяцідзесяці выканаўцаў. Музычны ўзровень выканання песень быў высокі. Усе дзеткі і моладзь з нецярплівасцю чакалі свайго выхаду на сцэну і стараліся як найлепш паказаць свае ўмеласці...*

## *Слова пра Паэта* ☞ 9

Міра Лукша

*Толік Сыс ехаў у свой Гарошкаў на Гомельшчыне, пад Рэчыцай. Як з кожнай вясной. Да хворай мамы, да дзядзькі Валодзі, да землякоў. Парыбачыць, пачытаць. „Пасылай мне «Ніву» ў Гарошкаў, там прыходзяць да мяне сябры, бяруць, чытаюць", — сказаў мне на Вербніцу. Збіраўся дахаты. Ды не, не паедзе: „Ты ж прыедзеш праз два тыдні. Буду цябе чакаць...*



# Ліка ці Анжаліка?

Прайшоў год з таго часу, калі энергічная запальваючая Руслана выйграла конкурс песні Еўрабачання, авалодала тэмпераментным украінскім „хэй" сэрцамі большасці тэлегледачоў і здабыла для сваёй краіны гонар быць гаспадарамі гэтага музычнага спаборніцтва еўрапейскай песні ў гэтым годзе. На Украіну прыехалі прадстаўнікі музычнага шоу-бізнесу амаль усіх еўрапейскіх дзяржаў. Беларусь у 2005 годзе прадстаўляла спявачка Анжаліка Агурбаш.

Назіраючы за выступам амбітнай беларускай спявачкі задумваешся, як цесна звязаны лёсы і творчасць людзей з тым, што робіцца ў іх краіне. Некалі савецкай школьніцы, якая займалася ў тэатральнай студыі, прапанавалі зняцца ў масоўцы. А калі завялі размову пра больш сур'ёзную ролю ў кіно, то хіба ў той час можна было жадаць чагосьці большага, чым кар'ера акторкі. Гэта быў яшчэ СССР. Мы, беларусы, тады ўжо „звыкліся" да ролі „малодшых братоў" вялікага рускага народа. І дзе, як не ў Маскве, трэба было шукаць свой шанц. Для таленавітай Анжалікі раскрывае дзверы школа-студыя МХАТ. Але яе сям'я ў БССР. І трэба вяртацца. Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, нараджэнне першай дачкі, перабудова... У людзей мяняюцца ментальнасць, погляды на кар'еру, мажлівасці сябе выявіць і зарэкамендаваць. З'яўляецца першы конкурс прыгажосці і Анжаліка — міс Беларусі. Пасля выступы ў знакамітых „Верасах", далей уласная сольная кар'ера. Ліка Ялінская (так яе ведалі беларускія слухачы) стала адной з самых папулярных і любімых айчынных спявачак. Рэспубліка Беларусь ужо была незалежнай краінай, са сваёй старадаўняй сімволікай і адзінай дзяржаўнай беларускай мовай. Рэпертуар спявачкі шырыцца песнямі на роднай мове. Яна спявае пра Пагоню, пра белае віно і чырвоне, пра чарачку... Гэтак жа робяць і іншыя. І Іна Афанас'ева, і Анатоль Ярмоленка, і... Хіба ўсіх пералічыш. Беларуская песня загучала на поўную моц, славячы матчынай мовай сваю краіну, народ, характар беларусаў...

Але ў сярэдзіне дзевяностых з экранаў беларускіх тэлевізараў нам зноў нагадалі што мы „малодшыя браты", і што без „багатага, старэйшага брата" не маем ніякіх шанцаў на поспех. Мова гэтага „брата" стала ў Беларусі „роўнай" нашай. Пачалі мяняцца школьныя і універсітэцкія праграмы, зноў загаварылі „па-руску" рэктары, дэканы, чыноўнікі, улада... Беларускамоўны рэпертуар стаў змяншацца і ў творчасці Лікі. І не толькі ў яе. Тое ж рабілі ўжо згаданыя Афанас'ева, Ярмоленка і яго дачка з прыгожым беларускім імем Алеся... А хто трымаўся свайго, той не меў вялікіх шанцаў патрапіць не толькі на расійскія блакітныя экраны.

Беларусы чарговы раз паехалі за „шчасцем" у Маскву. І не толькі будаўнікі, прадаючы сваю працу на расійскіх будоўлях, але і ўлада, шукаючы „таннай" нафты, і некаторыя творчыя асобы. У тэлевізійных інтэрв'ю Ліка Ялінская з захапленнем расказвае пра жыццё маскоўскай музычнай эліты, перайімаецца, што ў нас яшчэ не так... Яна па-ранейшаму любімая і паважаная беларускімі слухачамі спявачка, выступае на імпрэзах у гонар шасцідзесяцігоддзя вызвалення Беларусі, на славянскіх базарах, на тэлебачанні і радыё. Яе творчасць таксама цесна звязаная і з беларускай тэматыкай. Упершыню ў гісторыі айчыннай музыкі эстрадная песня, якую спявачка прысвяціла Еўфрасінні Полацкай, была блаславёная мітрапалітам.

Зараз, узяўшы прозвішча мужа, Анжаліка Агурбаш паспрабавала дасягнуць поспеху на еўрапейскай пляцоўцы па-англійску. Прыкладам, прадстаўніку Харватыі яго родная мова не перашкодзіла патрапіць у фінал. Анжаліка не патрапіла. Беларускі тэлевядучы, разам з усімі тэлегледачамі Беларусі пераймаўся гэтым фактам, пытаўся што мы не так зрабілі. А адказ просты. Мы не змянілі навязанага нам стагоддзямі менталітэту. З упэўненасцю, што наша спявачка вартая самага высокага месца, трэба адзначыць, што шанцаў, узяўшы ў прадзюсеры расійскага Кіркорава, які сам з трэскам праваліўся на еўрапейскім музычным алімпе, было шукаць марна. Ці апрануцца ў расійскага Юдашкіна, які адмыслова для беларускай спявачкі зрабіў сукенку вагой 40 кілаграмаў (?!). Давядаўшыся пра вагу — можна на сукенку і не глядзець. Закаваць элегантную колішнюю міс Беларусі ў панцыр маглі толькі там. Можа царыцы Кацярыне яна і падыходзіла б, але толькі ў Расіі. Ідучы па перамогу ў Еўропу, трэба навучыцца думаць па-свойму. Гэта значыць паеўрапейску, па-беларуску.

**Віктар САЗОНАЎ (Гродна)**

# Жэст



У час маскоўскай алімпіяды ў 1980 годзе польскі скачок з шастом Уладзіслаў Казакевіч уславіўся не толькі перамогай, але і жэстам, які разам з прозвішчам спартсмена ўзбагаціў фонд ідыёмаў польскай мовы. Ганарысты ўчынак чэмпіёна быў праявай шматвяковага польска-маскоўскага супрацьстаяння, якое, мабыць, увайшло ў гены і выпрацавала стабільныя ўмоўныя рэфлексы.

У аналізах сучаснай гісторыі не ўдалося мне заўважыць меркавання, што гэты жэст спартыўнай злосці спарадзіў ланцужок выпадкаў, якія прывялі да змены грамадскага парадку на вялікай частцы зямнога шара. Але пакуль даўнасць гэтай падзеі будзе парадку ўзросту дзеючых палітыкаў, вароты ў гісторыю будуць Казакевічу закрыты, а вучні ў школах будуць зубрыць другія прозвішчы — мо нават штогод іншыя.

Сёлета адбыліся юбілейныя святкаванні 60-годдзя заканчэння другой сусветнай вайны ў Еўропе. Гаспадыняй урачыстасцей была Масква. Як я ўжо ў гэтым месяцы пісаў, галоўныя героі юбілейнага мерапрыемства ўдзел у ім падпарадкавалі палітычным мэтам. У іх ліку і прэзідэнт Кваснеўскі.

Наш прэзідэнт бадай за ўсю сваю прысутнасць на найвышэйшай дзяржаўнай пасадзе ўзначальваў рэйтынг палітыкаў, якім польская грамадзяне найбольш давяраюць. Спадар Кваснеўскі дабіваўся гэтага нескладанымі прыёмамі: прыглядаўся, з якога боку дуе вецер, пільна сачыў падзеі ў палітычнай атмасферы.

Пасля згаданай змены грамадскага парадку ў Польшчы пачалі змяняцца і палітычныя норавы. Палітычнай сцэнай сталі авалодваць асобы, гатовыя цаною любой шуміхі прабіцца да ўладнага карыта, а іхнім бурным спектаклям, здаецца, наша сцэна замалая. Асабліва вытанчанае палітычнае мастацтва паказалі яны ў час пятамайскіх спрэчак пра роспуск Сейма.

Вось і перад маскоўскім самітам над Польшчу насунуліся палітычныя цыклоны і антыцыклоны, тузаючы нашага Аляксандра за рукавы і полы то туды, то сюды: ехаць — не ехаць. Найшумнейшыя былі тыя парывы, якімі кіравалі не толькі згаданыя раней умоўныя рэфлексы, але і ваенны вопыт вынесены з выгаднага тэленазірання за прыгодамі чатырох танкістаў і сабакі. Гэта не тое, што нейкі Ярузельскі, які вайну глядзеў сваімі вачыма. І наш Кваснеўскі паехаў у Маскву, каб і на свой лад, як калісь Казакевіч, выканаць шумны жэст, не надта прымеркаваны да даты заканчэння вайны, а ўжо асабліва — да маскоўскіх палітычных вектараў.

Падзею гэту, па сутнасці, зафіксавала адна толькі Варшава. Масква быццам таго жэсту не заўважыла, але і ў яе фондах немалы набор не толькі сродкаў палітычнай пантамімы, але і рычагоў рэальнага ўздзеяння на палітычную атмасферу, якая пасля святкаванняў заўважна пахаладзела. У ліку згаданых рычагоў — Мінск, да якога пульт кіравання ў крамлёўскай палітычнай рубцы, што дазваляе Маскве наносіць шумным ветэранам удары з зусім нечаканых напрамкаў.

Пра выбар новых улад Саюза палякаў Беларусі я ўжо, па сутнасці, і забыўся, таму выкананая там Мінскам ракіроўка з вяртаннем старога праўлення засцігла мяне быццам спрасонку. Можа б нават яе і зусім не заўважыў, калі б не прычынены ёю шумны ўзаемаабмен Варшавы і Мінска выдварэннямі дыпламатаў і абяцанне польскім знешнепалітычным ведамствам забароны ўезду на тэрыторыю Еўрасаюза некалькім мінскім чыноўнікам, што праявілі ў гэтай справе знамянальную актыўнасць. Калі пішу гэтыя словы, спісак тых чыноўнікаў яшчэ не абнародаваны...

Наколькі мне ўдалося заўважыць, вернуты мінскімі ўладамі на пасаду старшыні СПБ Тадэвуш Кручкоўскі з'яўляецца палітычным майстрам на ўсе рукі, віртуозам, на якога салідная ўлада можа спадзявацца ў кожных абставінах. І менавіта гэты таленавіты чалавек — было не было — першы ўзняў тую шуміху, да якой так шпарка далучылася Варшава. Цікава вось, як да яго гэтая Варшава паставіцца: ці апладзіруе яму, ці пакажа жэст Казакевіча, уносячы палітычнага генія ў спісак знамянальных актывістаў...

Грамадству беларускіх палякаў аб'яўлены свайго роду шах. Гэта не першы раз меншасці расплачваюцца за відовішчныя палітычныя подзвігі. Не выключана, што нейкі рыкашэт ад апошняй перашуміхі закране і нас.

**Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

**Вачыма еўрапейца**

# Вайна, войначка?



Сур'ёзныя санкцыі чакаюць Беларусь з боку Польшчы і праўдападобна астатніх краін Еўрапейскага Саюза. Маюць яны абмінуць звычайных грамадзян, але поўнасцю абрынуцца на прадстаўнікоў адміністрацыі прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, у тым ліку на суддзяў, пракурораў, сілавыя структуры і, мабыць, таксама на іх сем'і да галоўных рэдактараў рэжымных СМІ і — падобна — на беларускіх спартсменаў, якіх выкарыстоўваюць для прапагандысцкіх мэтаў. Да такіх высноў прыйшлі, між іншым, парламентарыі ў час дыскусіі на тэму польска-беларускіх адносін.

— У адносінах да Беларусі нельга нам прымяняць страусавую палітыку, — пераконваў адзін з паслоў Сейма.

Дыскусію справацыравала рашэнне дзяржаўных улад палічыць сакавіцкі з'езд Саюза палякаў Беларусі несапраўдным. Масла ў агонь падлілі атакі прэзідэнта Лукашэнкі на Польскае пасольства ў Мінску і ўрэшце прызнанне персонай нон грата першага сакратара пасольства Марка Буцькі.

Штораз часцейшыя пошукі ворага ў Польшчы міністр замежных спраў Адам Ротфельд тлумачыць боязззю Аляксандра Лукашэнкі страціць кантроль за ўнутранай сітуацыяй, што давядзе да мірных дэмакратычных перамен, падобных тым у Грузіі ці на Украіне. Сакрэтам палішынеля з'яўляецца тое, што Саюз палякаў Беларусі гэта самая вялікая няўрадавая арганізацыя ў рэспубліцы (гавораць пра 25 тысяч членаў), а пасля выбару яго старшынёю Анжалікі Борыс і адхілення ад гэтай пасады Тадэвуша Кручкоўскага, арганізацыя можа стаць пагрозай для спакойнага функцыянавання — як яе называюць у свеце — дыктатуры.

У ходзе сеймавай дыскусіі віцэ-міністр замежных спраў Анджэй Залуцкі адзначаў:

— Цалкавітае спыненне кантактаў з Беларуссю ў выпадку Польшчы было б рашэннем памылковым. Паслядоўнасці нашых дзеянняў не могуць абрынуцца на беларускае грамадства. Гэта не толькі атака на СПБ, але і на ўсю беларускую апазіцыю. Уладам Беларусі трэба знайсці ворага дзеля ўнутранай кансалідацыі. У гэтай краіне перамены непазбежныя. Гэта толькі справа часу. Каб адбыліся яны як найхутчэй.

Віцэ-міністр адзначыў, што Польшча будзе намагацца забароны ўезду прадстаўнікоў рэжыму расцягнуць на ўвесь Еўрасаюз. Паведаміў ён таксама, што ўжо састаўлены папярэдні спісак неўязных асоб, які пэўна будзе яшчэ папоўнены. Урэшце — згодна спадзяванням парламентарыяў — Анджэй Залуцкі загаварыў аб гатоўнасці стварыць незалежную радыёстанцыю (аднаўленне Радыё „Рацыя", стварэнне Радыё Вольная Беларусь? ). Калі б мела яно вяшчаць на тэрыторыю ўсёй Беларусі, неабходная была б каардынацыя дзеянняў з Літвой і Украінай. Папярэдне вядома, што грошы на гэтую мэту мае прызначыць Еўрапейская Камісія.

Не думаю, што гэтая „вайна" неўзабаве скончыцца. Чарговы пункт сцэнарыя, які можа здарыцца, гэта закрыццё беларускім бокам дзяржаўнай мяжы. Калі б да гэтага дайшло — а гэта магчымае, бо прэзідэнт Лукашэнка, як сказаў міністр Ротфельд, чалавек непрадказальны — быў бы гэта самы чорны сцэнарый, які непасрэдна ўдарыў бы па грамадзянах, асабліва Беларусі. Стварылася б ім тады своеасаблівае абсалютнае гета.

Не дай Бог!

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

*Палякі паўтары стагоддзя не мелі сваёй дзяржаўнасці і цяпер алергічна рэагуюць на ўсё, што магло б гэтай дзяржаўнасці пашкодзіць. І ўспрымуць падвойныя назвы мясцовасцей як наступ меншасцей на польскія дзяржаўныя і нацыянальны інтарэсы...*

# Ніколі не ўзыдзе сонца?

Маладая дзяўчына з сімпатычнай усмешкай. За ёй абрыс карты Польшчы з вялікай кропкай у паўночна-ўсходнім рагу. І подпіс: *Ja żywu u Polszczy.* Такія чорна-белыя плакаты ўбачыў я на Вялікдзень у Бельску.

Акрамя рысунка і аднаго простага сказа на плакаце не было нічога. Ніякай даты, ні прозвішча аўтара, ні назвы арганізацыі. „Цікавы, ненахабны голас, — першае, што мне падумалася, — у дыскусіі над двухмоўем ва ўсходняй Беласточчыне”. Змест і форма плакатаў падказвалі, што за акцыяй — маладыя людзі. „Ура, — хацелася закрычаць, — моладзь наша! Без комплексаў, адукаваная, бывалая ў свеце, ведае сваю вартасць і правы. Не губляе з поля зроку істотнае”.



Фота АЛІНЫ ВАЎРАНЮК

*Славакі не баяцца растварыцца ў іншародным моры*

Дайсці да тых, хто прыдумаў і расклейваў плакаты не было цяжка. Але... лепш бы я гэтага не рабіў. Лепш было заставацца ў плакатна-ілюзорным свеце, чым так расчаравацца.

Другое маё расчараванне ў апошні час — улады горада Гайнаўкі. У інфармацыйнай праграме *Obiektyw* Польскага тэлебачання Беласток ад 4 мая сакратар Гарадской управы Міраслаў Аўксенцюк і бурмістр Анатоль Ахрыцюк, як чорт ад крыжа, адхрышчваліся ад самой думкі двухмоўных шыльдаў у іх горадзе. Першы гаварыў пра грошы, маўляў, гэта каштавацьме падаткаплацельшчыка 20 тысяч злотых. Другі перасцерагаў перад магчымым выбухам варажнечы між палякамі і беларусамі з-за падвойных шыльдаў. А хто ж гэтага хоча?

Анатоль Ахрыцюк — канкрэтны палітык і надзвычай сімпатычны чалавек. Люблю яго, нягледзячы на тое, што ў тэлебачанні не выпадае ён эфектоўна (а мне, з прычыны месца працы, гэта не малаважнае): гаворыць ціха, без тэатральных жэстаў, палымяных дэкларацый, якія парываюць натоўп. Але і не дае пустых дэмагагічных абяцанняў. І ў адрозненні ад многіх крыкуноў, спачатку думае, а потым гаворыць. Пэўна і выступленне ў *Obiektywie* было прадуманае. Ён, як гаспадар горада, не хацеў бы нікога пакрыўдзіць, а кожная змена тоіць у сабе рызыку, што можа камусьці не спадабацца. Лепшае тое, што ведаем, хай сабе і недасканалае, чымсьці новае, невядомае. Што, калі з прычыны беларускіх надпісаў частка жыхароў Гайнаўкі адчуе сябе нешчаслівымі? А бурмістр жадае — я веру, шчыра — усім у яго горадзе дабра.

Мой бацька паўтарае: усім не дагодзіш нават у сям’і. Няма мовы, спадар бурмістр, каб удалося гэта вам у, хай сабе невялікім, горадзе. Шкада, што ў інфармацыйным выпуску тэлебачання не было ні месца, ні часу, каб развінуць думку і растлумачыць гледачам, чаму беларускія назвы мясцовасцей меліся б давесці да варажнечы між старымі суседзямі. Мне асабіста такое здаецца неверагодным, калі не зусім абсурдным.

Што тычыцца грошай, то тыя няшчасныя 20 тысяч можаце запісаць у рубрыцы: рэклама. Пра ваш горад, напішуць газеты, пакажуць яго ў тэлебачанні, загавораць ва ўсёй Польшчы. І не кажыце, што гэта малаважнае ў сітуацыі, калі сякую-такую перспектыву на будучыню даюць Гайнаўцы толькі Белавежская пушча, турызм, паслугі і рэгіянальная адметнасць. Усе ў Гайнаўцы сёння падкрэсліваюць, як расславіла горад у Польшчы царкоўная музыка. Чаму? Таму, што такога нідзе больш няма. А пачаткі — пра гэта мала хто помніць — не былі ружовыя. Не ўсе адразу былі энтузіястамі фестывалю. А ці сёння хто-небудзь уяўляе сабе Гайнаўку ў маі без рознамоўнага і рознагалосага пяяння ў саборы Святой Тройцы?

Няхай праціўнікі фактычнага, а не толькі дэкларатыўнага зраўнання ў правах нацыянальных меншасцей з польскай большасцю б’юць у званы. Трывога! Чарговы раздзел Польшчы! Хай больш памяркоўныя тлумачаць, што такія развязкі — чужыя польскай традыцыі, што палякі паўтары стагоддзя не мелі сваёй дзяржаўнасці і цяпер алергічна рэагуюць на ўсё, што магло б гэтай дзяржаўнасці пашкодзіць. І ўспрымуць падвойныя назвы мясцовасцей як наступ меншасцей на польскія дзяржаўныя і нацыянальны інтарэсы. Аднак жа, захаваннем правапарадку займаюцца адпаведныя органы, а станам душы — псіхіятры.

Тым, якія хочуць нечаму навучыцца і паглядзець, як такія пытанні вырашаюць суседзі, рэкамендую экскурсію ў Славакію. Увесь поўдзень гэтай краіны названы не толькі па-славацку, але і па-венгерску, а паўночны-ўсход — па-ўкраінску. І гэты малы народ, які сваю дзяржаўнасць будуе ўсяго з 90-х гадоў мінулага стагоддзя, не баіцца ні страты суверэнітэту, ні дамінацыі меншасцей. А там жа на пяць мільёнаў грамадзян, мільён несславакаў!

Можа нашы гміны знайшлі б пару злотых на такую экскурсію, скажам, радным? Славакія недалёка, дык не абыдзецца гэта дорага. Няхай пры нагодзе пабачаць, што двухмоўныя шыльды не ставіліся за кошт, скажам, рамонтаў дарог. Бо і аднаго, і другога можам толькі славакам пазайздросціць.

Было б цудоўна, калі б на канцы аўтобуса знайшлося некалькі месц для нашай будучыні— студэнтаў. Тут я вярнуся да майго першага расчаравання. Так як я думаў, плакаты, якія мяне так узрадавалі на Вялікдзень, расклеіла моладзь. А дакладней — група студэнтаў. На жаль, віселі яны (зразумела, плакаты) коратка. Дзе былі хутка заклееныя, а дзе яшчэ хутчэй сарваныя. Каб акцыя не засталася бясследнай, запрапанаваў я яе ініцыятару, што пакажу гэта ў тэлебачанні. І тут атрымаў я серыю адказаў на не. Бо, гэта ніякі голас у дыскусіі над двухмоўем, а проста акцыя дзеля акцыі групкі сяброў. Нічога яны гэтым не хацелі сказаць. Нічога страшнага, што плакаты так хутка зніклі, як неспадзявана паявіліся. Можа і лепш, бо хтосьці ў бары ў Гайнаўцы па-п’янаму сказаў, што каб толькі ведаў, хто клеіў плакаты, то наклеіў бы яго па мордзе. Таму арганізатары акцыі хочуць застацца ананімнымі. Вось табе на! Ну і байцы! Наша будучыня, якой свет да ног сцелецца!

Дзетачкі, мае даражэнькія, усё перад вамі, усё, чаго захочаце, будзе вам дадзенае, адно глыбей капайце вашы норы! Бо, калі такі Шэрлок Холмс як я знайшоў вас пасля двух званкоў тэлефона, то ваша падземная схованьвельмі плыткая. Памятаеце: *Мы жывем пад зямлёю, мы пацукі ды мышы*?

**Мікола Ваўранюк**

**TOWARZYSTWO OCHRONY KRAJOBRAZU**

w trosce o rozwój naszego regionu mówi głośne

**TAK**

**dla dwujęzycznych nazw miejscowości**

- dla możliwości korzystania z języka białoruskiego w urzędach
- dla rozwoju świadomości i dumy narodowej wszystkich mieszkańców

*Nasz język to nasze bogactwo, nasza duma, dziedzictwo naszych przodków, nasz dar dla naszych dzieci. Nikogo nie trzeba o tym przekonywać. Dzisiaj to od nas zależy, czy będziemy umieli zachować język od zapomnienia, wyprowadzić go z domowych zakamarków na ulice naszych miast i wsi. Powiedz TAK!*



**ТАВАРЫСТВА АХОВЫ КРАЯВІДУ**

дзеля дабра нашага рэгіёна голасна кажа

**ТАК**

**двухмоўным назовам мясцовасьцяў**

- магчымасьці карыстацца беларускай мовай ва ўстановах
- развіцьцю сьвядомасьці і нацыянальнага гонару ўсіх жыхароў

*Наша матчына мова, гэта наша багацьце, наш гонар, спадчына нашых продкаў, наш дар нашым дзеткам. Нікога ня трэба пераконваць у гэтым. Сёньня ад нас залежыць, ці здолеем мы ўратаваць мову ад забыцьця, вярнуць яе з хатніх куткоў на вуліцы нашых гарадоў і вёсак. Скажы ТАК!*

## Цяжкі час для шпіталя

На 2005 год шпіталь у Бельску-Падляшскім заключыў пяць дагавораў з Нацыянальным фондам здароўя на наступныя медыцынскія паслугі:

— шпітальнае лячэнне,

— спецыялістычная амбулаторная апека,

— доўгатэрміновая апека,

— лячэнне псіхічных захворванняў і залежнасцей,

— суфінансаваныя паслугі.

Заключаны дагаворы валавой вартасцю ў амаль 13,3 млн. зл. (на няпоўныя 2% больш чым годам раней). У рамках паасобных пагадненняў у параўнанні з мінулагоднімі ёсць істотныя разыходжанні. Найважнейшым з іх з'яўляецца адсутнасць кантракту на падстаговую начную і святочную аздараўляльную апеку.

Вынікі дагавораў на паслугі пракаментавала дырэктар бельскага шпіталя Бажэна Гратовіч:

— Агульна ацэньваючы размеркаванне НФЗам сродкаў з узбуйненых на 0,25% здароваахоўных складчын, можна заўважыць, што толькі нязначная іх колькасць трапляе ў павятовыя шпіталі. Большасць з іх накіроўваецца на падставовую ахову здароўя і ў вялікія клінічныя і ваяводскія бальніцы. Да таго адзінкавыя цэны паасобных працэдур не пагашаюць іх коштаў. НФЗ усё павышае патрабаванні адносна аснашчэння і персаналу, але не адводзіць ніякіх сродкаў на развіццё шпіталяў. Таму наш шпіталь вымушаны шукаць сродкаў па-за НФЗам, за якія можна было б праводзіць неабходныя інвестыцыі. Важная тут роля вядучага органа і іншых суб'ектаў самакіравання, бо ўсе павінны быць зацікаўлены далейшым утрыманнем шпіталя ў Бельскім павеце і яго прагрэсам.

Чарговай праблемай становіцца адліў на працу ў замежжа кваліфікаваных медыцынскіх кадраў — лекараў і медсясцёр. Таксама клінічныя і ваяводскія шпіталі пераходліваюць персанал, прапануючы ім карысныя фінансавыя ўмовы. Трэба тады ўлічваць неабходнасць павышэння зарплат дзеля захілення ад убывання медыцынскага персаналу шпіталя, — падкрэсліла дырэктар Бажэна Гратовіч.

Міхал Мінцэвіч

## Колико даеши

У 1942 годзе спатрэбілася мне метрыка нараджэння. Пайшоў я да свайго бацюшкі, якім тады быў а. Уладзімір Дарашкевіч (будучы мітрапаліт Васілій). На маё пытанне колькі мне трэба заплаціць за метрыку, ён мне адказаў: „Колико даеши вопреки не глаголют".

А сёння за пахаванне пакойніка патрабуюць 800-1000 зл. Нашы святары гавораць: „Вам даюць з КРУСу або ЗУСу, то і нам давайце". Ці гэта па-божаму, каб за дзве гадзіны пахавальнага абраду браць 800 зл. і яшчэ прысутнічаць на пачастунку. Калісьці я пісаў на гэтую тэму, але ніхто з царкоўных кругоў не адгукнуўся.

Я, як і многія пенсіянеры, жыву за 600 зл. цэлы месяц.

Дзядзька Захар

# Гродна — Крынкі




Быўшая сінагога ў Крынках

***Як ствараецца традыцыя? Непрыкметна. Год за годам, справа за справай. Цікавасцю, жаданнем, захопленасцю, настойлівасцю людзей. Усіх гэтых якасцей з лішкам хапае вучням і настаўнікам двух навучальных устаноў: гімназіі № 1 горада Гродна і гімназіі мястэчка Крынкі ў Падляшскім ваяводстве.***

***Кантакты нараджаюць кантакты. Знаёмства ў кастрычніку 2001 года намесніка дырэктара гімназіі па навукова-метадычнай працы В. Р. Карнелюка і метадыста ліцэя А. П. Госцева на адной з педагагічных канферэнцый з Сакратам Яновічам стала першым крокам да традыцый. Сакрат Яновіч прапанаваў і арганізаваў сустрэчу з дырэктарам гімназіі ў Крынках Евай Копец. На сустрэчы былі абмеркаваны дэталі першага спаткання гімназістаў і настаўнікаў.***

*Гэтае спатканне на польскай зямлі ў лютым 2002 года было знаёмствам. Нашымі спадарожнікамі былі вучні і настаўнікі ліцэя № 1. Крынскія гімназісты сустракалі гродзенцаў у сваёй школе, вадзілі па сваіх пенатах і сардэчна радаваліся нашаму візіту. Культурная праграма для гасцей з Гродна складалася з афіцыйнай сустрэчы з войтам Крынак ва ўпраўленні гміны, з наведвання агратурыстычнага комплексу ў наваколлі Крынак, здзіўлення ад дзеючай мячэці ў Крушынянах і, канешне ж, знаёмства з беларускім пісьменнікам Сакратам Яновічам, гаспадаром знакамітай „Villa Sokrates". Мы ўсе зразумелі, што Крынкі — гэта Сакрат.*

*Затым адбылася сустрэча на нашай Гродзенскай зямлі ў красавіку 2003 года. Мы падаравалі крынцам уражанні ад нашай гімназіі, нашага Гродна і радзімы Элізы Ажэшкі.*

*Наступным крокам нашых кантактаў стала ўжо практычнае супрацоўніцтва ў галіне даследчай дзейнасці. Мэтай сустрэч было вырашана зрабіць школьныя канферэнцыі. Добра, што шмат навуковых тэм звязвае нас: агульная прырода, цесная гісторыя. Таму красавік 2004 года стаў часам удзелу вучняў Гродзенскай гімназіі ў экалагічнай канферэнцыі ў Крынках. Навуковыя даклады Эльвіры Нікалаевіч і Сяргея Батуры былі добра ацэнены ў Крынках.*

*Цяперашні 2005 год працягвае традыцыю нашых сустрэч, адразу ж двума спатканнямі. Спачатку польскія гімназісты ўдзельнічалі ў рабоце нашай 8-ай адкрытай навукова-практычнай канферэнцыі „Новыя філаматы", якая традыцыйна праходзіць у лютым на творчым тыдні нашай гімназіі.*

*Затым 19-20 красавіка мы сталі не толькі ўдзельнікамі, але суарганізатарамі міжнароднай канферэнцыі „Дні Халакоста ў Крынках". Гэтая канферэнцыя была прысвечана 60-годдзю перамогі над фашызмам. Пра гэтыя падзеі мне хацелася б расказаць у дробязях.*

*Калі мы прыехалі ва ўжо знаёмую гімназію ў Крынкі, добразычлівыя гаспадары сустрэлі нас вельмі прыветліва. Мы зноў убачылі знаёмыя твары вучняў і настаўнікаў. Да канферэнцыі заставалася каля гадзіны, і мы вырашылі, не губляючы часу, паглядзець на Крынкі. Сваю невялікую экскурсію мы пачалі з цэнтра Крынак. Менавіта тут знаходзіцца невялікі парк у выглядзе шасцівугольніка, з кожнага вугла якога адыходзяць па дзве вуліцы (планіроўка здзіўляе). Затым мы накіраваліся да касцёла св. Ганны: велічны касцёл заваражвае сваёй магутнасцю і прыгажосцю. Месцазнаходжанне касцёла таксама унікальнае: стоячы каля ўваходу, можна бачыць Крынкі як на далоні. Далей мы накіраваліся да праваслаўнай царквы, дзе асабіста ад свяшчэнніка даведаліся пра гісторыю гэтага храма. Увогуле, трэба адзначыць, што Крынкі напоўнены кантрастамі: багаты катэдж — і хатка з саламяным дахам, касцёл у неагатычным стылі і праваслаўная царква — усё гэта складзена разам.*

*Далей мы ўсёй групай накіраваліся да будынка раней дзеючай сінагогі (цяпер кінатэатр), дзе і павінна была адбыцца канферэнцыя. Калі мы зайшлі ў прызначаную залу і ўбачылі вялікую колькасць людзей, мы адразу зразумелі, што, менавіта, памяць пра тыя жахлівыя падзеі сусветнай вайны збліжаюць нас: беларусаў, палякаў. І нам ёсць аб чым расказаць адзін аднаму.*

*На канферэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі яўрэйскіх арганізацый з Варшавы, прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, жыхары Крынак і добра знаёмы нам Сакрат Яновіч. Праграма канферэнцыі складалася з пяці раздзелаў. Тры з іх былі нашымі часткамі. Гэта навуковыя даклады Алены Кузміч і Алены Пажарыцкай пра гісторыю яўрэяў у Гродне, гісторыю яўрэйскіх гета на тэрыторыі горада і мой даклад пра П. А. Наўмюка.*

*Першымі выступалі гаспадары, якія ўзгадвалі пра яўрэяў гета Крынак і, увогуле, пра іх жыццё ў час ІІ сусветнай вайны. Затым канферэнцыю працягнулі выступленні гімназістаў з Гродна, якія суправаджаліся відэафільмам. Яркай і заключнай часткай канферэнцыі сталі музычныя выступленні: дзяўчынкі з Гродна споўнілі знакамітую „Хавана гілу", а Уладзімір Баум — „Паветраны шар" з рэпертуару „Н.Р.М.".*

*Увечары ўсе вучні сустрэліся ля кастра для таго, каб лепш пазнаёміцца, пагутарыць. На наступны дзень, сабраўшы ўсе рэчы, абмяняўшыся адрасамі і тэлефонамі, мы развіталіся з нашымі польскімі сябрамі і, канешне ж, паабяцалі, сустрэцца зноў, тым самым працягнуць добрую традыцыю сустрэч.*

Юлія Шталікава (Гродна)

## Шанц для агрутурызму

4-5 мая 2005 года ў Белавежы былі арганізаваны занняткі ў рамках польска-беларускага праекта „Прыязнае асяроддзю развіццё вясковых тэрыторый", якія праходзілі пад лозунгам „Вясковы турызм — новы шанц у рэгіянальным развіцці". Мерапрыемства фінансавалася са сродкаў Праграмы развіцця ААН.

У сустрэчы ўдзельнічала дэлегацыя з адзінаццаці чалавек, якую састаўлялі прадстаўнікі лакальнай улады і СМІ Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" з Беларусі, а Гайнаўшчыну рэпрэзентавалі прадстаўнікі Павятовага старостава, Еўрарэгіёна „Белавежская пушча", Управы горада Гайнаўкі, Белавежскага нацыянальнага парку, Сусветнага фонду дзікай прыроды і Агратурыстычнага таварыства „Зубр".

Мэтай спаткання было паказанне суседзям з-за мяжы вопыту ў галіне развіцця турызму на нашым баку пушчы, а таксама паказанне магчымасці і спосабу вывучання праграмы, якая паслужыць яго развіццю на вясковай прасторы.

У час дыскусіі прадстаўнікі Гайнаўскага самаўрада, як і агратурыстычных устаноў падзяліліся сваім вопытам з беларускімі гасцямі, прычым асноўную ўвагу накіроўвалі на задачы агратурызму ў развіцці рэгіёна і яго эканамічныя эфекты.

Удзельнікі дыскусіі задумоўваліся над тым, які напрамак павінна мець развіццё трансгранічнага турызму пасля адкрыцця пагранічнага перахода ў Грудках, абмяркоўвалі пытанні аховы прыроды, захавання культурных і ландшафтных каштоўнасцей.

Беларускія госці мелі магчымасць наведаць гайнаўскія агратурыстычныя кватэры, Нацыянальны парк, запаведнік зуброў, асяродак лясной адукацыі „Ягелонскае", ды сустрэцца на супольнай вячэры ў сяле Буды.

Заняткі праводзіліся спецыялістам па справах вясковага агратурызму д-рам Янушам Маеўскім. Удзельнікі спаткання вызначылі патэнцыяльныя турыстычныя прадукты, якія могуць выступаць на польскім баку пушчы. СВОТ-аналіз (аналіз моцных і слабых бакоў праекта, магчымасцей і пагроз) паказаў, што ў пяці раёнах Белавежскай пушчы ёсць магчымасць выбірання унікальных, канкурэнтных турыстычных прадуктаў, якія могуць быць атракцыйнам для турыстаў з Польшчы і замежных краін.

Прадстаўнікі Беларусі маюць свядомасць шанцаў і пагроз, якія нясе развіццё вясковага агратурызму. Назначылі яны мэты і напрамкі дзейнасці неабходныя для вывучання вясковага турызму ў прэзентаваных сабою рэгіёнах.

Уладзімір Сідарук

# Не дазволілі крыжоў



Міхал Боўтрык



Дарота Высоцкая



Ала Матрэнчык



Анна Радзюкевіч



Яўген Чыквін

**У гэтыя дні „Przegląd Prawosławny" адзначае свой дваццацігадовы юбілей. Аб працоўных буднях штомесячніка расказваюць члены рэдакцыйнага калектыву.**

*— Як нараджаўся „Przegląd"?*

**Ала МАТРЭНЧЫК, сакратар рэдакцыі:** — Праца над запускам газеты доўжылася некалькі месяцаў, бо між нас не было нікога, хто раней займаўся рэдакцыйнай працай. Я была ў Свята-Мікалаеўскім саборы, калі бацюшка запрапанаваў вернікам наш першы нумар. Сябра сказаў мне: „Разыходзіцца, як цёплыя булачкі!" Неўзабаве пахваліла і Ада Чачуга з „Нівы": „Удалося вам цалкам прыстойна!" Такі прыём нашай працы адухаўляў нас.

Адным з першых сяброў нашай рэдакцыі быў Яўген Міранові́ч, які пісаў пра свецкія праблемы г.зв. Усходняй сцяны, калі іншыя матэрыялы кранал і рэлігійных тэмаў. У ліку першых нашых супрацоўнікаў былі таксама журналісты „Нівы" Мікола Гайдук і Віктар Рудчык.

*— З якіх крыніц набіраеце матэрыялы для сваёй працы?*

— Спачатку карысталіся мы „Журналом Московской патриархии", але ён даходзіў да нас нерэгулярна і марудна. Але, на наша шчасце, недзе з паловы 70-х гадоў у Францыі стаў выходзіць штомесячны „Праваслаўны прэсавы сервіс". Яго выпускалі праваслаўныя выхадцы з усходу Еўропы і Лівана, людзі элітарнага складу, культурныя і адукаваныя, якія трымалі шчыльныя кантакты з айчыннымі цэрквамі; іхнімі бюлетэнямі карыстаемся і па сённяшні дзень. Пасля перамен на ўсходзе Еўропы з'явіліся новыя інфармацыйныя крыніцы, праваслаўныя інтэрнэтавыя сервісы.

*— Як выглядалі першыя нумары „Przeglądu"?*

**Анна РАДЗЮКЕВІЧ, намеснік галоўнага рэдактара:** — У віньеце, у фоне загалоўка, не дазволілі тады паказаць крыжоў, адно пустыя купалы. Толькі з чацвёртага нумара цэнзура зняла гэтую забарону.

*— Якім тэмам найбольш месца адводзіць цяпер „Przegląd Prawosławny"?*

— Галоўны націск ставім на справы веры, культуры, інфармацыі. Не абыходзім і палітыкі, калі яна кранае нашых людзей. Нашы чытачы любяць нашы ўласныя допісы з замежжа. Найбольш цікавяць іх інфармацыі з усяго абшару Усходняй Еўропы.

Супрацоўнічаем з мінскім Беларускім брацтвам Трох віленскіх мучанікаў ды з фінскім выдавецтвам „Logosmedia". Фінская і наша цэрквы невялікія і ў нас шмат паралеляў. Пераадолеўшы афіцыйны атэізм у нашай, краіне мы многаму ў іх навучыліся, м.інш. іканапісу і працы з моладдзю; гэта працягваецца і па сёння.

Знаёмствамі з новымі людзьмі мы ўзбагачаем погляд на ўсё праваслаўе, на яго вонкавыя і ўнутраныя праблемы і клопаты; гэта дапамагае нам гаварыць адным голасам у карысць Царквы, пранікаць у свецкія асяроддзі. Нягледзячы на захоп грамадскай думкі манапалістычнымі сродкамі масавай інфармацыі, стараемся прабівацца са сваім голасам, сваімі рацыямі.

*— У Беларусі зацвярджаны кананічны пераклад Біблії на беларускую мову. Ці „Przegląd" будзе спрыяць яе распаўсюджванню ў прыходах Беласточчыны?*

— У Мінску, з удзелам мітрапаліта Філарэта, адбылася нядаўна афіцыйная прэзентацыя Евангелля на чатырох — беларускай, рускай, грэчаскай і царкоўнаславянскай — мовах. Аднак не ведаю пра перспектывічны абсяг гэтай ініцыятывы, ці яна ўвогуле да нас дойдзе.

*— Якія мэты на вашым прыцэле?*

**Дарота ВЫСОЦКАЯ:** — Я ў рэдакцыі з'яўляюся свайго роду асаблівасцю, я — каталічка. Прывяла мяне за сабою Аня Радзюкевіч. Я спачатку мала ведала аб праваслаўі, знаёмілася з яго адметнасцю, нават з тэалогіяй. Але я — тутэйшая, з Беласточчыны, праваслаўе з'яўляецца часткай маёй спадчыны і я лёгка тут прыжылася. Займаюся я, галоўным чынам, размеркаваннем матэрыялаў для друку.

*— Якія прынцыпы пуцяводныя ў вашай працы?*

**Міхал БОЎТРЫК:** — Верна перадаць атрыманую інфармацыю. Можа гэта праяўляцца ў розных формах. У фельетоне павінен быць і нейкі ўкол, штуршок. А ў рэпартажах стараюся найцікавей і верна — каб не змяніць сэнсу — перадаць тое, што хвалюе людзей.

*— Як „Przegląd Prawosławny" служыць Царкве?*

**Яўген ЧЫКВІН, галоўны рэдактар:** — Царква праводзіць сваю місію праз літургічнае жыццё. Мы выконваем дапаможную функцыю, кшталтуем свядомасць людзей і інфармуем пра царкоўнае жыццё ў Польшчы і замежжы, паказваем універсалізм праваслаўя.

*— Ці ваша праца падлягае душпастырскаму нагляду Царквы?*

— Мы фармальна і фінансава незалежныя ад Царквы, але ў справах веры прызнаем аўтарытэт іерархаў. Калі здараюцца памылкі ў справах веры — бо здараюцца, — тады прымаем сур'ёзныя ўвагі іерархаў і стараемся такіх памылак не дапускаць.

*— Ці ў рэдакцыйным асяроддзі абмяркоўвалася пытанне далейшага кшталту праваслаўя ў аспекце асіміляцыі?*

— Прадстаўляем розныя аргументы, аднак у рэдакцыі трымаемся традыцыяналістычнай думкі, каб людзей навучаць, асабліва царкоўнаславянскай мове, бо гэта лічым нашым козырам.

*— У Сейме Вы былі галоўным хадайнікам па справе закону аб нацыянальных меншасцях. Ці ваша рэдакцыя будзе агітаваць за яго ўкараненне, напр., за двухмоўныя назвы?*

— Я шмат гаварыў з людзьмі пра гэта, паказваў яго вагу ў тармажэнні наступаючай паланізацыі. Але нашы людзі асцярожныя, так па рацыянальных, як і падсвядомых перадумовах, баяцца рэакцыі польскай большасці. Людзі нажылі вопыт і нельга ім гэтага празмерна навязваць. Спадзяюся, што праз 3-5 гадоў, за прыкладам літоўцаў ці немцаў, і нашы пабачаць, што гэта можа быць карысна. І толькі калі людзі самі даспеюць да такога рашэння, тады можна разлічваць на яго трываласць.

Распытваў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

## Як даехаць?

У гэтым годзе ў нашай дзяржаве плануюцца парламенцкія і прэзідэнцкія выбары ды рэферэндум наконт прыняцця Еўрапейскай канстытуцыі. Адны палітыкі хочуць, каб усё адбылося ў адзін раз, іншыя — каб паасобна, мабыць, тады выбаршчыкам будзе лепш усё зразумець. Але ніхто з палітыкаў, як левых, так і правых груповак, не клапоціцца на чым даедуць у выбарчыя ўчасткі пенсіянеры з г.зв. „забітых дошкамі вёсак" на Усходняй сцяне.

Прывяду прыклад маёй вёскі Бялкі і навакольных, што ў Нараўскай гміне. Тут курсіруе аўтобус у дні школьнай навукі, а ў суботы і нядзелі аўтобуса ПКС няма, ён адменены. Таксама на час летніх канікулаў адмяняюць аўтобус і тады старэчам няма на чым дабрацца нават да лекара, хоць ты жывым лезь у яму, гэта нікога зусім не цікавіць. Гмінны самаўрад аб гэтым не клапоціцца, кажа няма ў нас грошай на тое, каб вашай справай яшчэ займацца. Павятовым уладам гэта непатрэбна — кажуць, што ў вас ёсць салэцкая рада ды гмінны самаўрад, няхай яны пра вас клапоцяцца. Кожная ўлада адпіхае ад сябе сялян-пенсіянераў, яны ім проста непатрэбныя.

Палітыкі перад выбарамі, каб прыцягнуць выбаршчыкаў на свае спіскі, прыдумоўваюць розныя лозунгі, маняць абяцанкамі, але пасля галасавання — калі нават выйграюць выбары — то вельмі хутка забываюць аб сваіх лозунгах, і выбаршчыках. У іх толькі адна думка — як абяспечыць сваю сям'ю і стварыць сабе як найлепшы дабрабыт.

Гутарыў я з рознымі людзьмі і з вёсак, і з горада, то пераважна чуў адзін адказ: „На зладзеяў галасаваць не пайду!".

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

## Слаўны юбілей В. Шведа

Ад юбілею Віктара Шведа ў мяне гарачая, сардэчная мэта: дачакаць Яго круглы юбілей — стогадовы, каб песнямі гучалі Шведавы словы.

Паважаны, дарагі Дружа! Далей ідзіце наперад слаўна і мужна, узбагачайце вершамі нашу адвечную кнігу ў маразы, спякоты, адлігу. Восемдзесят гадоў гэта, лічыць, шмат, і я гэтаму вельмі задаволены, рад што Вы ў такім веку духова малады, бо і я хацеў бы ўступіць у такія рады. Пішыце далей, бо маеце каму: не толькі сябрам, Натальцы ці мне аднаму, але ўсяму беларускму народу, „Ніве", бо Вам чужое слова „лянівы".

Жывіце багата, у здароўі і ў сям'і дружна! Вы нам герой, бо слова беларускае бароніце мужна. Мала таго: Вы — беластоцкі Купала! Дык няхай Вам будзе чэсць, пашана і хвала. І ад мяне паклон нізкі, бо мне Віктар Швед — чалавек дарагі, вельмі блізкі.

Мікалай ПАНФІЛЮК

# зорка

для дзяцей і моладзі




Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)




Выступаюць гімназісты з Орлі

## Вершы Віктара Шведа

### Выйграў паланеза

*— Ці чуў, што Пеця наш, гарэза,*
*Выйграў нядаўна „Паланеза"?*
*У Коле фартуны, ці Латарэі*
*Адбылася гэта падзея.*

*— Ды гэта ж іншая імпрэза:*
*Агінскага ён паланеза*
*Выйграў істотна нечакана*
*У конкурсе на фартэпіяна.*

### Тупая брытва

*Настаўнік лае вучня Віцю:*
*— Чаму не хочаш ты вучыцца?*
*Ты не рыхтуешся ніколі,*
*Сорам прыносіш нашай школе.*

*Вяду здаўна з табою бітву.*
*Хоць маеш прозвішча ты Брытва,*
*Можа з табою таму дрэнна,*
*Што ты такі тупы страшэнна?*

# „Беларуская песня" — лаўрэаты

**Дашкольнікі і вучні I-III класаў падставовых школ**

— салісты: I месца — **Паўліна Паўлючук** з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім; II месца — **Магдаліна Бабік** з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку; III месца — **Павел Гаінскі** з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку, **Міраслаў Давідзюк** з Падставовай школы ў Рыбалах, **Катажына Куптэль** з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі;

— дуэты, тэрцэты, квартэты: III месца — **Ніка Барташэвіч, Аляксандра Нікалаюк** з Падставовай школы ў Рыбалах.

**Вучні IV-VI класаў падставовых школ**

— салісты: II месца — **Юстына Давідзюк** з Падставовай школы ў Рыбалах; III месца **Эдыта Сухар** з Комплексу школ у Орлі, **Агата Гаўрылюк** з Падставовай школы н-р 6 у Беластоку;

— дуэты, тэрцэты, квартэты: I месца — **Эвеліна Лясота, Мілена Каральчук** з Комплексу школ у Нараўцы; III месца — **Эвеліна Дунда, Марта Дземянюк, Дар'я Маркевіч** з Падставовай школы ў Арэшкаве.

**Гімназісты**

— салісты: I месца — **Юліянна Дораш** з Бельскага дома культуры (вучаніца бельскай „тройкі"), **Паўліна Капытка** з Комплексу школ у Чыжах; II месца — **Эдыта Гелмецка** з Нараўкі; III месца — **Сільвія Камінская** з Гарадскога асяродка культуры ў Кляшчэлях;

— дуэты, тэрцэты, квартэты: I месца — **Бэата Калышка, Эвеліна Вышкоўская** з Комплексу школ у Аўгустове; II месца — **Паўліна Капытка, Анна Карнілюк** з Комплексу школ у Чыжах; III месца — **Ірміна Леанюк, Марыёля Герман** з Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы; маладзёжны квартэт з Беластока пад кіраўніцтвам **Анны Садоўскай**.

**Вакальныя і вакальна-інструментальныя калектывы**

— падставовыя школы: I месца — „Праменьчыкі" з Комплексу школ у Чыжах, „Журавінка" з бельскай „тройкі"; II месца — вакальны калектыў з Падставовай школы ў Залуках; III месца — вакальны калектыў з Падставовай школы ў Арэшкаве;

— гімназіі: I месца — „Камертон" з Гімназіі ў Аўгустове; II месца — вакальны калектыў „Гурток" з Гімназіі ў Аўгустове, вакальны калектыў „Росквіт" з Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных; III месца — вакальны калектыў з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі, вакальны калектыў „Арлянскія званочкі" з Гміннага асяродка культуры ў Орлі, вакальны калектыў „Калінка" з Залук.

**Хоры**

I месца — хор Гімназіі з Нараўкі; II месца — хор Падставовай школы з Нараўкі.

Асобныя ўзнагароды за добрае тэхнічнае выкананне твораў атрымалі калектывы „Вясёлка" і „Капрыс" з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім.

*Аляксей Мароз*




Марыёля Герман ды Ірміна Леанюк з Гайнаўкі




Юліянна Дораш з Бельска

# Чорная як галка

Галка па велічыні значна меншая ад вароны ці грака, важыць да 250 грамаў. Апярэнне ў яе чорнае, з металічным бляскам на спіне і плячах, шыя шэра, дзюба кароткая. Вядомая яна ва ўсёй Еўропе, Азіі апрача яе поўначы і поўдня, у Паўночна-Заходняй Афрыцы і Малой Азіі. Аблюбавалі яны каменныя будынкі, званіцы, воданапорныя вежы. Таму часцей можна галку сустрэць у мястэчках ці гарадах, чым у вёсках. Я звярнула першы раз увагу на вялікую чараду галак, якія, у час, калі вёў заняткі па фізкультуры пан Валік, удала перакрыквалі яго з аграмадных дрэваў, што растуць у падворышчы семяноўскай царквы. Слухай, яны крачыць „птах, птах", — сказала я другой Мірцы, а яна, адна з лепшых спартсменак у класе, паглядзела на мяне са здзівам: а чаго ж дзівавацца, што птах заяўляе, што ён — птах? Галак была процьма, і відаць было іх выразна на аголеных дрэвах ды на званіцы. Ахвотна селяцца яны ў парках і садах з дуплістымі дрэвамі, а таксама на абрывах рачных далін, у лясах і гаях, у развалінах. Большасць галак трымаецца месца гнездавання. Размнажацца пачынаюць не вельмі рана, найчасцей з паловы красавіка. Гнёзды размяшчаюць у самых розных месцах: пад карнізамі будынкаў, у шчылінах у пустых частках будынкаў, у комінах, за вывескамі крамаў, у дуплах дрэў, у норах у шчылінах скал, у дзірках паміж камянямі, а часам у гнёздах гракоў ці сіваваронак. Адно і тое ж гняздо выкарыстоўваюць пару гадоў. Гняздуюцца невялікім групамі па 2-3 ці дзесяткамі. Гняздо будуе пара разам. Яйкі складваюць па 4-6, а часам па 7 блакітна-зялёных з буравтымі пятнамі, якія канцэнтруюцца на тупым канцы яйка. Самка наседжвае іх 18-20 сутак. Вылет птушанят у сярэдзіне чэрвеня. Пасля вылету галкі качуюць выводкамі. У другой палове лета збіраюцца яны сотнямі і часам качуюць разам з гракамі. Зімою збіраюцца ў больших мясцінах. Там разам з варонамі трымаюцца да вясны, вылятаючы раніцай на ўскрай горада і пад гарады на жыраванне, а вечарам вяртаюцца на начлег. Кормяцца лістаедамі, жужалямі, слонікамі, чарнацелкамі, хрушчамі і іншымі насякомымі, якіх з ахвотай знішчаюць, чым прыносяць немалую карысць сельскай гаспадарцы.

І, вось, калі праязджаю каля нашай школы, на ўсё старэйшых аграмадных прыцаркоўных ясенях і ліпах — наступныя пакаленні чорных птахаў. Гэта ўспамін майго дзяцінства. Ды каля нашай школы няма ўжо дзяцей... І пана Валіка няма...

**Міра ЛУКША**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марк, Арыядна і Альдона

# У чацвер размаўляем па-свойму

У гэты дзень у Ягуштове многа радасці і новых уражанняў. Вось кожны вучань можа звярнуцца да настаўніка і па-свойму спытаць пра кантрольную, або пра ацэнку на канец школьнага года. Можна і пра іншыя, вядома, справы...

Ігар Лукашук, настаўнік беларускай мовы, не скрывае, што найбольш залежыць яму, каб дзеці самі так гаварылі між сабою.

Ці размаўляеце па-свойму між сабой, з іншымі дзяцьмі? — пытаю вучняў чацвёртага класа.

— Я размаўляю з братам, — кажа Марк Манаховіч. Пасля пералічвае яшчэ імёны сваякоў, дваюрадных братоў і сясцёр. Я навучыўся ад таты і бабулі (бабуля Марыя Манаховіч, была калісьці дырэктарам ПШ у Ягуштове). Яна піша ў „Ніву". У „Зорцы" друкаваліся вершыкі спадарыні Марыі пра зіму.

— І я размаўляю па-свойму з бацькамі, — кажа Арыядна Хадакоўская. Мама Арыядны — настаўніца, тата — святар. Дзяўчынка заўсёды прымае ўдзел у дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова". З захапленнем апавядае пра песні, якія спяваюць на ўроках роднай мовы: гэта „Купалінка", „Простыя словы", „Рэчанька"... Арыядна сама музыкантка — іграе на піяніна.

— А я іграю на арганах, — заяўляе сяброўка па парце Альдона Емеліта. І яна ўмее па-свойму.

Пасля дзеці апавядаюць пра клас. На ўрокі роднай мовы ходзіць 18 асоб. Пад канец сустрэчы ўжо ўсе чацвёртакласнікі пачынаюць гаварыць на падляшскім дыялекце.

— У нашым класе добрыя сябры, — кажа Марк Манаховіч. — Калі здарыцца нейкая несправядлівасць — дык мы адзін за аднаго заступаемся!

У тым вось і справа!

**ЗОРКА**

Іван МУРАВЕЙКА

## *Сонца*

*Сонейка свеціць*
*Ад ранку да вечара,*
*Сонейка грэе*
*Ад ранку да вечара*
*І не таму,*
*Што рабіць яму нечага.*
*Хоча яно,*
*Каб шумелі сады,*
*Каб у садах спелі*
*Дзецям плады,*
*Каб колас у полі*
*Хіліўся к раллі,*
*Каб травы раслі*
*І каб кветкі цвілі,*
*Каб людзі шчасліва*
*Жылі на зямлі.*

## *Мама*

*Колькі слоў напісалі*
*пра цябе паэты.*
*Усе паўтаралі:*
*найдаражэйшы чалавек*
*на свеце — Ты.*
*Ніхто не сказаў,*
*як цяжка працуеш.*
*Вочы твае пот і слёзы*
*часта заліваюць.*
*Пашаны ад мужа і*
*часта ад дзяцей не маеш.*

**Адам ЮРЧУК, Гайнаўка**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Магда Дарашук з Гайнаўкі

# Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў "Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 18: Парог, жырафа, гусі, паж, Ян, смак, кладка, Вялікдзень, рой, разета, сказ, яд, хор, карабель. Воск, Рыга, яйка, руж, ар, пас, кірза, фіялка, Надзя, дзед, аскет, манах, ох, горка, яр.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Якуб Сухадола**, **Юліта Скепка** з Нараўкі, **Аня Карпюк** з Кленік, **Эвеліна Ігнацюк**, **Кася Шыла** з Чыжоў, **Наталля Герасімюк** з Дубін, **Уршуля** і **Аляксандра Ніканчук** з Гарадзіскаў, **Эвеліна Магельніцкая**, **Лідка Пякарская**, **Юля Савіцкая**, **Эля Зайко** з Беластока. Віншуем!



# *Развітанні, вяртанні*



Як хацелася б мне яшчэ раз у малым мястэчку прабегчы сцежкай, што працінае прастору, парослую ядавітымі крапівамі і срэбнымі асатамі, абмінуць высокі комін, што выхінаўся з-за руінаў былое малачарні, абмінуць абрысы падмуркаў ад выгарэлых у час вялікай вайны дамоў. Ды чаго ж бегчы? Каб перагнаць усіх, ці, можа, прынесці таемную, шыфраваную вестку? Ды каму ж мне яе перадаць?

Як хацелася б мне наведаць старога прафесара ў яго доме з зашклёнай верандай, за якім распасціраўся сад, а ў садзе была глыбокая студня, на дне якое ў белы дзень мільгацелі зоры. Гэты дом быў таямніцай. З веранды пераходзіў ты ў змрочны калідор, поўны шэптаў і ценяў, а ў глыбіні адчыняліся дзверы і ў струмені святла я бачыў нутро пакоя са сценкамі аж пад столь, запоўненымі кнігамі, скарбам для мяне; быў я тады апантаным чытачом, пажыральнікам друкаванага слова, аповедаў аб справах цудоўных гэтага свету і справах змрочных, зямных. Калі з цяню выхінулася прыгорбленая постаць прафесара, застыў я ў здранцвенні, бо забыўся адказаў на пытанні, дарэчы, забыўся саміх пытанняў. Ці ж не правалійся я на такім важным экзамене па запамінанні?

Ды гэта ж было, было і прапала. Няма тых прастораў, гэтых дамоў, гэтых людзей, не існуюць, рассыпаліся, сатлелі. Сцвярджаю тое, што самае простае, можа, найбольш банальнае — што ў сапраўднасці няма ніякага вяртання. Калі вяртаю ў памяць тхлань дзяцінства, мае быць яно і сховам, і катлавінай, месцам аддыху ад пагрозлівай рэальнасці, ад сёння — вяртанне як тэрапія, як бы ні было, адзін з матываў псіхааналізу Зігмунда Фрэйда. Ды ведаю ж таксама, што тое саснёнае, выплаканае дзяцінства — небяспечнае, калі становіцца ўцёкамі ад цяжару адказнасці, ад спелага выбару, ад ярма індывідуальнай свабоды, ад пакуты штодзённага жыцця-быцця.

Бытуем, усё ж, у рэвалюцыйную эпоху хуткіх перамен, якія накідвае нам сучаснасць і яе дачка-глабалізацыя. „Вялікае сутрасенне", як гэта называе Фрэнсіс Фукуяма, або „трэцяя хваля" паводле Алвіна Тофлера. Тым больш важна, каб стрымаць пагрозлівае імкненне, каб пашукаць трывалай апоры — для перадыху, для рэфлексіі, для творчасці.

Таму спрабуем ураціваць ад забыцця тое, што калісьці было каштоўным — прывід мінулага часу, колер ягоны, думкі ды ўчынкі яго цудоўных людзей — каб нясмела перадаць пароль нашым наследнікам. Каб не бытавалі хвілінай, каб не сталі чымсьці такім як пырынка, несеная абыякавым ветрам. Ды праблема ў тым, каб хацелі нас паслухаць.

**Ежы Плютовіч**

# Спяваюць па-беларуску




*Дашкольнікі з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку выступалі вельмі адважна*

**У XXXII выпуску конкурсу „Беларуская песня", арганізаванага для вучняў падставовых школ і гімназій, які 13 мая праходзіў у Бельскім доме культуры, выступіла каля пяцідзесяці выканаўцаў. Музычны ўзровень выканання песень быў высокі. Усе дзеткі і моладзь з нецярплівасцю чакалі свайго выхаду на сцэну і стараліся як найлепш паказаць свае ўмеласці.**

Тыя вучні, што прыехалі на конкурс упершыню, вельмі ўважліва сачылі за выступленнямі калег. Хацелі навучыцца ад сяброў як весці сябе на вялікай сцэне дома культуры. Асобную групу састаўлялі наймалодшыя выканаўцы з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку, якія не спалохаліся шматлікай публікі і адважна вялі сябе ў час спявання. Сярод сабраных найбольш было вучняў. Побач іх сядзелі бацькі і знаёмыя. Больш дарослых аматараў беларускай песні прыйшло на канцэрт лаўрэатаў, які адбыўся пасля конкурсных выступленняў. Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ, якое з'яўлялася арганізатарам мерапрыемства, звярнуў увагу на рост колькасці ўдзельнікаў конкурсу „Беларуская песня". Настаўнікі прапанавалі арганізаваць раённыя агляды, бо дзеткам і моладзі цяжка выседзець у час доўгага адбору.

— Я заўсёды хвалююся перад конкурснымі выступленнямі, а эмоцыі адыходзяць пасля спеву на сцэне, — заяўляе Паўліна Капытка з Гімназіі ў Чыжах, якая ўжо шосты раз выступіла на конкурсе „Беларуская песня".

Конкурсныя выступленні салістаў перапляталіся са спевамі дуэтаў, тэрцэтаў, квартэтаў і большых груп. Вялікія калектывы выступілі ў завяршальнай частцы мерапрыемства.

— У школьным калектыве добрыя сяброўкі і мы там добра сябе адчуваем. Спяваць любім лірычныя песні, а слухаем больш вясёлыя творы сярод сучаснага рэпертуару, — гаворыць Марыёля Герман і Ірміна Леанюк з Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы.

— Цяжка ў нас знайсці беларускамоўны рэпертуар, які падыходзіў бы для моладзі і не паўтараўся б у час школьных конкурсаў. Мала зборнікаў з песнямі трапляе да нас з Беларусі. Шукаю я песень на месцы, а пасля іх апрацоўваю. Дапамагае мне настаўніца беларускай мовы, — кажа Катажына Галашэвіч, якая рыхтавала да конкурсу дзяўчат з Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы.

Яшчэ перад самым выхадам на сцэну дзеткі слухалі заўваг сваіх мастацкіх кіраўнікоў і апекуноў. Вучні паўтаралі, у якой чарговасці будуць выходзіць на сцэну. Дзеткам спадарожнічалі інструктары з Беларусі, якія займаюцца з дарослымі калектывамі. Перад вучнёўскім конкурсам былі яны накіраваны для дапамогі настаўнікам.

— Па-беларуску мы спяваем у школьным калектыве. Спяваем таксама ў царкоўным прыхадскім хоры ў Орлі, — гавораць вучаніцы арлянскай Падставовай школы. Іх старэйшыя сяброўкі спяваюць у калектыве пры Гмінным асяродку культуры.

У новым складзе калектыву „Журавінка", які дзейнічае ў бельскай „тройцы", спяваюць вучні трэціх класаў. Дзяўчаткі інфармуюць, што любяць спяваць беларускія песні. Сустракаюцца яны са спевам пабеларуску ў бацькоўскіх дамах і ў сваіх бабуль. Беларускія песні спяваюць таксама на занятках беларускай мовы.

У многіх настаўнікаў з вялікіх гарадскіх школ прафесійная музычная падрыхтоўка. Пачынаюць яны займацца з дзеткамі з індывідуальнай працы з кожным вучнем. Настаўнікі вялікіх школ, як хаця б бельскай „тройкі", маюць такі козыр, што з вялікай колькасці вучняў могуць вылучыць шмат таленавітых выканаўцаў.

— Мы любім спяваць і таму рашыліся выступаць у школьным калектыве. Па-беларуску спяваюць у нашых сем'ях. Мы спяваем таксама ў царкоўным хоры. У час конкурсу стараемся слухаць песні іншых выканаўцаў, каб нечаму навучыцца, — кажуць Барбара Карыцкая і Наталля Лаўранюк, вучаніцы пятага класа Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім, якія з верасня мінулага года займаюцца ў новастворaным калектыве „Вясёлка". Кіруе ім Анна Вярцінская, якая ў пачатку школьнага года заснавала таксама калектыў „Капрыс" (сярод гімназістаў). Старэйшыя выканаўцы з бельскай „тройкі" таксама выступілі на беларускім конкурсе.

— У калектывы выбірала я найбольш таленавітых дзетак і моладзь. Нашы дзяўчаты любяць спяваць пабеларуску, хочуць спяваць і незалежна ад вынікаў будуць надалей выступаць на сцэне. Вучні спяваюць песні, якія найбольш ім падабаюцца і гэта я лічу самым важным у нашай працы, — заяўляе музычны кіраўнік Анна Вярцінская. — Аранжыроўку песень я рыхтавала самастойна, а словы пісаў настаўнік беларускай мовы Яраслаў Падолец.

— У Гімназіі н-р 13 у Беластоку няма навучання беларускай мовы. Да ўдзелу ў конкурсе заахвоціла нас кіраўнік нашага царкоўнага хору, — гавораць вучаніцы з Беластока.

— Я кірую маладзёжным царкоўным хорам, што дзейнічае пры царкве Прамудрасці Божай. Падрыхтавалі мы беларускамоўныя спектаклі „Масленіца" і „На Каляды", з якімі выступалі ў Цэнтры культуры „Сподкі" і прыхадской святліцы. Да песеннага конкурсу падрыхтаваліся чатыры асобы, якія ўжо размаўляюць па-беларуску, — кажа Анна Садоўская, студэнтка Універсітэта ў Беластоку.

Конкурсы „Беларуская песня", а ў тым ліку і апошні, паказваюць, што вясковыя выканаўцы не мусяць уступаць іх гарадскім сябрам. Асаблівa высокі мастацкі ўзровень прэзентуюць тыя вясковыя калектывы, з якімі пастаянна займаюцца настаўнікі.

Вучні са школы ў Рыбалах з дапамогай настаўніцы Лідзіі Мартынюк склалі словы да сваіх песень.

— Падбіралі мы такія словы, каб падыходзілі да мелодыі і змест у цэлым нам падабаўся, — інфармуюць дзяўчаты з Рыбалаў.

Самае важнае, што ў час конкурсу сярод вучняў і настаўнікаў я не заўважыў нездаровага спаборніцтва і зайздрасці. Непрыстойныя эмоцыі расплываліся пад уздзеяннем беларускіх песень.

— Слухаючы беларускія песні мы становімся больш добрымі, сімпатычнымі і радаснымі, — учуў я ў час мерапрыемства.

**Аляксей Мароз**

# Царкве быць з народам

**Размова з праф. Антонам МІРАНОВІЧАМ.**

**„Ніва”:** — ***Ці пражываючы ў дзяцінстве ў Алексічах, што каля Заблудава, Вы былі свядомы слаўнай гісторыі гэтага мястэчка?***

**Антон Мірановіч:** — У нашым доме заўсёды былі жывымі беларускія традыцыі. Бабуля Дамініка цудоўна ведала гісторыю нашых зямель і магла цэлымі днямі распавядаць пра мінулае мне і майму брату Жэніку (Яўгену Мірановічу, таксама прафесару гісторыі). Былі там і апавесці аб Заблудаве, Пяценцы ды іншых царкоўных прыходах. На жаль, ні ў пачатковай, ні ў сярэдняй школах не мог я нічога даведацца пра нашу гісторыю.

***— Таму вырашылі стаць гісторыкам?***

— Пасля заканчэння пачатковай школы бацькі бачылі мяне як чалавека з канкрэтнай прафесіяй. Паслалі вучыцца ў беластоцкі механічны тэхнікум. Але ў сярэдняй школе я зразумеў, што не быць мне інжынерам. Паступіў я на гісторыю на філіяле Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. Тады распачатая прыгода з гісторыяй працягваецца і па сённяшні дзень.

***— Спадар прафесар, Вы з’яўляецеся гісторыкам Праваслаўнай царквы. Ці не баіцеся, што Вашая заангажаванасць у рэлігійна-грамадскае жыццё нейкім чынам уздзейнічае на гістарычны аб’ектывізм?***

— Безумоўна ёсць той фактар, што я — праваслаўны беларус і гляджу на гісторыю вачыма майго народа. Але мне здаецца, што мой погляд бліжэйшы аб’ектыўнасці чымсьці погляды гісторыкаў з каталіцкіх кругоў. Пра мінулае Царквы я пішу на аснове крыніц. Паказваюць яны выразна сувязь праваслаўя з беларускім народам. Царква стагоддзямі фарміравала рэлігійную і нацыянальную свядомасць нашых продкаў. Уплывы іншых рэлігій былі намнога меншымі сярод беларусаў і скіраванымі да вузейшых кругоў грамадства.

***— Вы моцна акцэнтуеце тэзіс пра сувязь Царквы з беларускасцю. Гледзячы сёння на Праваслаўную царкву ў Польшчы, здаецца, што яна мэтанакіравана імкнецца ствараць праваслаўных палякаў, чымсьці быць разам з беларускасцю на Беласточчыне?***

— Праваслаўная царква да канца XVIII стагоддзя давала падтрымку беларускасці. У XIX ст., хаця звярталася яна да нашых продкаў па-расійску, заставалася з народам. На жаль, сапраўды ў апошніх гадах мы бачым, што ствараецца ідэалогія польскага праваслаўя, якая



не мае ані гістарычнага, ані маральнага, ані канструктыўнага апраўдання. У канцы канцоў гэтая ідэалогія зашкодзіць самой Царкве. Большасць вернікаў нашай Царквы ў Польшчы гэта ж беларусы. І нат з гэтага факту належыцца ім божае слова на роднай мове, а не паланізацыя.

***— Заўсёды ў выказваннях падкрэсліваеце патрэбу партнёрства з польскай большасцю. Але сёння мы, як беларуская меншасць, надалей бываем патрэбнымі агульнапольскім партыям толькі хіба як „выбарчае мяса”?***

— Нашае грамадства не павінна падтрымоўваць тых партый, якія абыякава ці варожа ставяцца да нас. Хопіць таксама пустых дэкларацый. Мы самі павінны дабіцца самастойнага беларускага прадстаўніцтва на ўзроўні самакіравання ці Сейма. Тады для польскіх палітыкаў станем партнёрамі. Калі ў час выбараў мы аддаем галасы на польскія спіскі, а не на беларускіх кандыдатаў — то трацім таксама пашану і да саміх сябе як беларусаў.

***— Пашану трацім і праз фактар, што не хочам карыстацца належнымі нам законамі. Напрыклад, Закон аб нацыянальных меншасцях і аб двухмоўі...***

— Гэта сумная праўда. Шмат нашых чыноўнікаў баіцца сваёй беларускасці. Гэта вельмі добра відавочна звонку. Прыхільныя нам палякі здзіўляюцца такой пасіўнасці нашых мясцовых самакіраванняў. Войты, старасты павінны зразумець, што двухмоўныя надпісы і жывая беларускасць на іх тэрыторыі гэта дар лёсу, якім можна пакарыстацца для развіцця турызму, культуры, узмацнення гаспадарчага развіцця. Тут магчымае самае вялікае фінансаванне са сродкаў Еўрасаюза. Але нічога не атрымаецца, калі не зменіцца менталітэт мясцовых элітаў.

***— Вы верыце ў шанс развіцця беларусаў Беласточчыны?***

— Хаця ў свеце ёсць многа цікавых месцаў, у якіх я мог застацца, я заўсёды вяртаўся на Беласточчыну, маю Бацькаўшчыну. Таму і веру ў нас, беларусаў, што былі мы тут, ёсць і будзем.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Яўген Вапа**

# За самоту піў сваё віно

*Ёсць агідныя словы.*
*Агідных паэтаў няма.*
*І таму, як памру, — закапайце ў палескую гліну,*
*Жыць хачу, землякі, і легенду аддам задарма,*
*А за тое, што жыў, — пасадзіце ў нагах арабіну.*

Толік Сыс ехаў у свой Гарошкаў на Гомельшчыне, пад Рэчыцай. Як з кожнай вясной. Да хворай мамы, да дзядзькі Валодзі, да землякоў. Парыбачыць, пачытаць. „Пасылай мне «Ніву» ў Гарошкаў, там прыходзяць да мяне сябры, бяруць, чытаюць”, — сказаў мне на Вербніцу. Збіраўся дахаты. Ды не, не паедзе: „Ты ж прыедзеш праз два тыдні. Буду цябе чакаць. Калі раптам мяне тут не будзе, ідзіце да Вітаўта Чаропкі, ён цяпер такі самотны. Ты не забудзеш гэтага, праўда? А давай сёння пойдзем да Алеся Марачкіна. Абыдзем усіх зноў разам”. Назаўтра Толік меў наведаць урача, палячыць чатыры зубы. Пару разоў дастаць прыйшлося па мухаедах на дэманстрацыях, сумна смяецца. Ды чалавек і старэе. Бачыш, змаршчыны ў мяне, а ты ўсё не старэеш, ну, ты зусім як цыганка... А я на тваіх кнігах, што ў мяне ляжалі, ставіў людзям свой аўтограф: „Ад імя Міры Лукшы — Анатоль Сыс...” Карміць мяне Толік баршчом гарачым, чытае кнігі, расказвае, дзе быў, хто заглянуў сярод ночы да яго з „атрутным віном”, куды зноў пойдзем, а што там у Гарошкаве, у які мы летась завіталі, а Толік чакаў быў



Фота АЛІНЫ ВАЎРАНЮК

нас у Мінску... Пытаецца пра Радаслава, любуецца здымкам. „А ён тут у мяне стаяў на паліцы, паміж Драздовічам і Багдановічам, і кожны гаварыў, што ў яго вочы мае... Хоць ён не Люцыян... Будзеце, заходзьце, калі раптам мяне не будзе, дык ключы пакіну ў Алы Канапелькі. Ты жыла тут, дык ведаеш, што і як. Мая хата — твая хата...”

Сядзіць каля мяне на сваім ложку Толік, нейкі быццам меншы, чым заўсёды. На стале — нацюрморт з газетамі, чорным хлебам, бутэлькай яблычнага віна, на наклейцы штосьці пра райскі плод. Пашукаў бы па шуфлядах вершы, бо ёсць яны, няпраўда, што не піша — даў бы Віцю Шніпу ў новы „Дзень паэзіі”. Заўтра скажа: „Адчапіцеся”. Ніякіх вершаў ён даваць не будзе. Апошні, з 8 сакавіка, забраў у Вільню Алег Мінкін. Вось кніга, якую знайшоў у Гарошкаве на гарышчы. Выглядае на даваенны падручнік па польскай літаратуры. Падпісвае мне яго з датай 3005 года... Вось так гаворым абы аб чым, старанна абмінаючы вестку пра выпадковую здраду дзяўчыны, якая нам абоім вельмі блізкая. „А ты ж мяне ёй адступіла...” Ды ўварвецца ў хату акцёр Анатоль Жук, разнясе ў шматкі таемныя весткі весткай аб сваім геніяльным рамане, які, вось, яму пішацца пра багемнае жыццё сталіцы, наўкідае нам у раты пладоў фінікавай пальмы, развярэдзіць душу зноўку. „Пасадзі, Міра, пальму мне ў вазон, я яе буду гадаваць. Крапіўку палі, і тую, як кажаш, маранту. Хай растуць. Бачыш, хата ў мяне цяпер як хата. Халадзільнік, сценка, тэлевізар... Жыць можна. А той папярэдні спёрлі... Не ведаю, хто”. „Ну,назапрашаеш усялякіх, да ўсіх з сэрцам!” — „І іконы павыносілі, і археалагічныя здабыткі... Даў грошы, не памятаю каму, дык ён і не купіў нічога, і прапаў зусім. Ды што там грошы!..” Калі ў краіне высыхаюць рэкі, калі сохне народ. Мілы сыночак, пачні жыццё новае, грэх блазнаваць у Хрыстовы гады. Хто Толіку не скажа: што ты робіш, апошні паэце Беларусі! Не скандаль! Цябе, які на сцяг падобны, на які і плюнуць можна, і парваць у шматкі, і патаптаць, Радзіма патрабуе. Каб як і тады, у канцы васьмідзесятых, светлага і адкрытага, твае словы запальвалі дух. Каб усталі Палуян, Драздовіч, Гарун, Жылуновіч, Каганец!.. Мы ж кахаем цябе, бо ты яшчэ не попел, і не прысак, вось такім — у боскіх іскрах і шампанскіх пырсках! Вось якая паэт боская птушка, як пад галавой нябожчыка падушка, вось якая паэт птушка боская, як свечка, як з воску я... Вось, Толік, ты тая пакутніцкая душа, як назваў цябе Арнольд Макмілін. Ён і на вестку аб тваёй смерці скажа: „Я больш ці менш і чакаў гэтага”. Мабыць, кожны з нас усіх прадчуваў, што раптам знікнеш, бо пішаш крывёю адно праўдзівыя словы, згарыш. І хоць весткі і раней хадзілі, што быццам ты памёр (а якраз памерла была твая матуля), і ў гэты раз не паверылі. Або пыталіся: „Самагубства?” Трагічны лёс трагічнага паэта трагічнага часу Радзімы? А Ты сабраў на астатнія дні прагу жыць... А ў сузор’я твайго, бы ў калосся ў жніво, ад пакуты надтрэснулі жылы...

*Бачыш, чырванее крой.*

Як сцяг, які трапеча вецер, як шматкі закрываўленага лёну, белай анучкі, што сцірае пот касца — я зноў прыйду, прыйду ў той вечар і буду ўжо з табой да скону з дарогі жорсткае наўпрост да раю, дзе з ногі вясковых плод нясе галіна старое яблыні, у якой саку кроў плыве прадзедаў і ў пяску, у балоце і ў гліне ўзрастаюць літасць, сум і веды. А ты чакай, а я прыеду. Я прыеду, крыху пасля, калі ўсе справы ўбачу. Выйду з адчаю, страху, плачу, мацнейшая за ўсіх. І лёсы перайначу.

*13.05.2005 г.*

**Міра Лукша**




# http://hart.3dway.org

Кажуць, што беларуская моладзь у значнай ступені палітычна пасіўная і яе амаль нічога не цікавіць. Калі прааналізаваць гэтае сцвярджэнне па наяўнасці беларускіх моладзевых сайтаў у Інтэрнэце, то высноваа пачынае здавацца не зусім слушнай.

Беларуская актыўная моладзь, як сведчыць сайт http://hart.3dway.org, прысутнічае не толькі ў сталіцы. Ёсць яна таксама і на перыферыі, прычым на той, што лічыцца пазбаўленай якой-кольвек палітычнай актыўнасці. Гаворка ідзе пра Гомельшчыну — вобласць на паўднёвым усходзе краіны.

На жаль, найбольшую вядомасць гэтыя мясціны набылі 19 гадоў таму, калі па цэлай планеце пачуўся выбух на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Радыеактыўны попел пасыпаўся і на адзін з прыгажэйшых беларускіх гарадоў, другі па колькасці насельніцтва краіны — Гомель. Большасць сённяшняй гомельскай моладзі цэлае сваё жыццё чуюць пра тэхнагенную катастрофу, што накрыла чорным крылом іх родны горад. Але, як бачна па азначаным сайце, нейкага ўздыму грамадскай актыўнасці гэта не дае.

Старонка „Галоўная" ўяўляе з сябе даволі неардынарнае для большасці сайтаў выяўленне. У версе чырвоны твар нейкага хлопца, з белым крыжам пасярэдзіне. Гэта такім чынам маладыя гамельчукі прапагандуюць старажытны герб свайго горада. Сам герб выкарыстоўваўся Гомелем з другой паловы шаснаццатага стагоддзя. Вакол галавы хлопца месцяцца выйсці да рубрык сайта. Іх не вельмі многа. Усяго шэсць. Але гэтага дастаткова, каб зразумець грамадска-палітычную скіраванасць гэтай моладзевай арганізацыі.

Далей на старонцы размешчаны кароткія навінныя паведамленні. Каб прачытаць іх поўную версію, трэба націснуць на „Падрабязна" ці выйсці на старонку „Навіны". Менавіта з гэтай рубрыкі мы можам даведацца, як праходзіла так званая Гадзіна Смутку ў Гомелі, якая павінна была ўвасобіць боль і жалобу чарнобыльскіх ахвяр.

Найбольш цікавай падаецца рубрыка „Пра нас". Вось тут распрацоўшчыкі пастараліся і мы маем магчымасць даведацца не толькі аб арганізацыі „Гарт", але і аб яе актывістах. Як сведчыць інфармацыя, моладзевае аб'яднанне пазіцыянуе сябе як рэсурсны цэнтр для моладзевых грамадскіх ініцыятыў. „Грунтуючыся на прынцыпах дэмакратыі і нацыянальных каштоўнасцях, Моладзевы цэнтр «Гарт» ставіць на мэце павышэнне грамадзянскай актыўнасці моладзі Гомельскай вобласці шляхам тэхнічнай падтрымкі моладзевых ініцыятыў і рэалізацыі культурніцкіх і адукацыйных праграмаў", — пішуць пра сябе сябры арганізацыі. Аб тым, наколькі ім удаецца дасягаць пастаўленых мэт, можна прачытаць на старонцы „Дзейнасць". Трэба адзначыць, што добрых спраў там указана шмат і гэта ўжо вялікі плюс арганізацыі. Але хіба адным з найцікавейшых можна назваць праект GOMEL HART NEWS. Гэта стужка навінных паведамленняў аб гомельскай моладзі, на якую могуць падпісацца зацікаўленыя асобы.

Ну і апошняя старонка — „Гасцёўня". Даволі часта наведвальнікі жадаюць „Гарту" трымацца. Гэта, відаць, таму, што ўтрымацца на версе незалежнай моладзевай арганізацыі ў Беларусі па сённяшніх часах вельмі няпроста. Таму і нам застаецца толькі далучыцца да такога пажадання.

**Уладзімір Лапцэвіч**



# Беларусь, беларусы...

Вострыя шаблі беларусаў

Беларускія майстры клінка заваявалі срэбра камандавых спаборніцтваў на вельмі прадстаўнічым турніры серыі Гран-пры „Шабля Валадыёўскага" ў Варшаве. На тле славутага мінулага айчыннага фехтавання і нявызначаных перспектыў гэты лакальны поспех стаўся пэўнай і прыемнай нечаканасцю.

Трэба зазначыць, што апошнія гады асноўныя дасягненні нашых фехтавальнікаў звязаныя якраз з камандай шаблістаў. У 2001 годзе беларусы сталі срэбнымі прызёрамі чэмпіянату Еўропы. На алімпіядзе ў Афінах Дзмітрый Лапкес быў блізкі да п'едэсталу, але заняў „крыўднае" 4-е месца. Па словах спецыялістаў, да гэтага часу ён не можа цалкам аднавіцца псіхалагічна. Але галоўнаму трэнеру Рыгору Лапатнёву ўдалося стварыць вельмі перспектыўную маладую дружыну. Акрамя Лапкеса ў яе складзе Аляксандр Буйкевіч, Валеры Прыёмка, Фёдар Неміровіч, Уладзімір Касцоў. Сапраўдным адкрыццём „Шаблі Валадыёўскага" стаў Буйкевіч. У асабістым турніры ён ушчэнт „пасёк" вельмі моцнага і дасведчанага расіяніна Аляксея Якіменку, а ў паўфінале перамог самога алімпійскага чэмпіёна італьянца Альда Мантана. Саступіў Буйкевіч толькі ў фінале, але і срэбра для маладога шабліста на такім салідным турніры, куды прыехалі пад сто трыццаць лепшых майстроў свету, безумоўнае дасягненне.

У камандавым турніры ў 1/8 фіналу Беларусь упэўнена адолела ўкраінцаў, у складзе якіх выступае чэмпіён свету Уладзімір Лукашэнка. У чвэрцьфінале нашых чакала традыцыйна моцная ў гэтым відзе Расія, з якой беларусы разабраліся без асаблівых праблем. У паўфінале супернікам стала Карэя, якая імкліва прагрэсуе і наступае на пазіцыі колішніх грандаў. Аднак беларусам азіятам прайсці не ўдалося. А ў фінале нашы сустракаліся з алімпійскімі прызёрамі італьянцамі. Беларуская каманда напрыканцы матча выйгравала з лікам 44:40, заставалася толькі адзін раз „зачапіць" суперніка, але Валеры Прыёмка (ён у свой час стаў чэмпіёнам моладзевага першынства кантынента) не здолеў гэтага зрабіць. Перамога літаральна выслізнулася з рук — першымі на турніры ўсё ж сталі апенінцы.

Што датычыць гістарычных заваёваў, то найбольш лаўраў для Беларусі прынёс славуты Віктар Сідзяк. Ён ажно шэсць разоў станавіўся чэмпіёнам свету (1969, 1970, 1971, 1974, 1975, 1979) у камандавым заліку, раз у асабістым (1969). На рахунку Сідзяка таксама ўласнае срэбра (1973), дзве бронзы (1971, 1974). Уражвае і алімпійская калекцыя знакамітага фехтавальніка — тры залатыя медалі (1972, 1976, 1980), срэбны (1972) і бронзавы (1976). Апошнім часам Сідзяк, які паспеў папрацаваць трэнерам у Італіі, актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю ў нядаўнастворбаным Клубе беларускіх алімпійскіх чэмпіёнаў. Зарэгістраваць, аднак, гэты клуб, у склад заснавальнікаў якога ўваходзяць такія яркія асобы, як былы вясляр, а цяпер палітык Уладзімір Парфяновіч, а таксама былы велагоншчык Уладзімір Камінскі, ніяк не ўдаецца. Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі арганізацыі. Прычына простая — занадта актыўная грамадская пазіцыя ініцыятараў Клуба.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

## Пятніца трынаццатага

*Калі каму-небудзь прыходзілася перасякаць мяжу на пачатку дзевяностых гадоў у пятніцу трынаццатага чысла, то ён мог на сваe вочы пераканацца, што кантрабандысты тых часоў былі народам даволі забабонным. Доўгія і нудныя, як прамовы савецкіх кіраўнікоў чэргі, кудысьці знікалі. Мала хто рызыкаваў у гэты дзень шукаць шчасця. Кожны меркаваў, што хутчэй нажывеш праблемаў на сваю дурную башку, чым здолееш нешта зарабіць.*

*Праўда, знаходзіліся і такія, што на справу глядзелі больш прагматычна, не звяртаючы ўвагі на патаемна-таямнічыя запалохванні малаадукаваных бабулек. Максім Гіль быў з такіх. Ён ганарыўся двума рэчамі. Першая, што паходзіў са старой праваслаўнай сям'і, для якой смех бацюшкі пра перажыткі паганскіх забабонаў быў большым аргументам, чым засцярогі баязлівых маларазумеючых рэлігійныя каноны калегаў. Другая, што ён кантрабандыст у сёмым калене. Майляў, у яго крыві і генатыпе ад продкаў перададзена ніколі не падманваючая інтуіцыя, якая беспамылкова інфармавала калі трэба сунуцца на мяжу, а калі лепш перачакаць няўдалую пару ў якой-небудзь гродзенскай забягалаўцы, паставіўшы па куфлю піва двум-тром канчаным алкашам з чырвонымі тварамі, сінімі насамі і вечна дрыжачымі рукамі, або свайму суседу мытніку, які, па ўсталяванай беларускай звычцы паважаць суседзяў, заўсёды, перад тым як прапусціць без праверкі машыну Гіля, вітаўся з тым за руку. Максім ганарыўся сваёй прафесіяй і сваімі законанепаслухмянымі продкамі. Ён сцвярджаў, што яго славутыя прашчуры пачалі перавозіць кантрабандныя цыгарэты яшчэ да таго, як Калумб першы раз убачыў тытунь у амерыканскіх індзейцаў, і калі дарога з Гродна на Беласток была вузкай звярынай сцяжынкай, і ніхто не мог нават у жахлівым сне ўбачыць, што калісьці яе перасячэ ўзараная паласа з калючым дротам. Таму славутая кантрабандная біяграфія яго сям'і пачыналася яшчэ на старажытным шляху з варагаў у грэкі. І сёння ён, чалавек з настолькі жудаснай, нават для памежных рэгіёнаў рэпутацыяй, калі хоць на адзін дзень спыніць працэс перараблення беларускага спірту ў грошы народаў ЗША з-за нейкіх старадаўніх перажыткаў, такіх як баязлівасць пятніцы трынаццатага, то яго геніяльныя продкі пераварочваюцца ў трунах.*

*Руслан Зелянковіч быў суседам славутага кантрабандыста і, па сумяшчальніцтву, яшчэ і звычайным інспектарам мытні ў першым калене, які абараняў на мяжы эканамічныя інтарэсы дзяржавы і падзараблял нявыплатай падаткаў ад атрымання дробных хабараў у выглядзе пляшкі гарэлкі ці блока цыгарэтаў. Гэтая добрадушэйная звычка выпіваць пасля працы за свае паслугі пляшкудругую з сябрамі супрацьлеглай прафесіі нечакана ператварылася ў неабходнасць штодзённай ранішняй пахмелкі.*

*У гэты дзень жаданых наведаць адзін з гродзенскіх рэстаранаў мусілі гадзінамі соўвацца па горадзе ў пошуку вольных месцаў. Усе бары былі забіты кантрабандыстамі. Выхадных дзён у людзей, што маюць гэтую работу з ненармаваным графікам не так і шмат. Таму пятніца трынаццатага, калі наведванне мяжы лепш пакінуць памежнікам, звычайна выкарыстоўвалася дзеля паглынання таго, што ў працоўныя дні лічылася таварам. А сучаснадумаючы Гіль з тае нагоды, што няма памежных чэргаў, меў надзею наведаць суседнюю краіну разоў пяць. Тым больш, што на мытні яму як заўсёды працягнуў руку сусед. Толькі нешта адразу пайшло не так.*

*— Гані машыну на яму, для спецагляду, — паміраючым голасам прастагнаў Зелянкевіч. Па перакошаным ад болю твары было бачна, што сёння мытніку яшчэ не давялося пахмяліцца. — Выбачай, але завітала нейкая праверка. Трэба паказаць што я працую. А іншых машын няма. Не едзе сёння чамусьці ніхто.*

*Максімава нахваленая інтуіцыя нічога кепскага не западозрыла. Але, калі пераехаўшы мяжу ён адкрыў адмыслова зробленае ў машыне для хавання спірту сховішча, то брудная лаянка хлынула з яго горла як у грузчыка з таварнай станцыі Ласосна. Сховішча было пустое. Гіль развярнуў машыну і панёсся шукаць помсты. Руслана на працы ўжо не было. Знайшоўся той у хаце, седзячы на канапе са шклянкай празрыстай вадкасці ў руках.*

*— Ты што гэта, брыда, суседа абкрадаеш? — прывітаўся яшчэ раз з мытнікам Максім. — Іншых няма, ці што?*

*— Не крычы. Мяне з-за тваёй гарэлкі з работы папёрлі, — спакойна адгукнуўся Зелянкевіч. Стан дзікага болю галавы і ламання касцей у яго плаўна, мінаючы звычайную чалавечую норму, пераходзіў у нірвану. — Сёння адзін ты швэндаўся паміж дзвюма славянскімі краінамі. Вось я і вырашыў пазычыць пару бутэлечак у цябе. А паколькі кантрабандыстаў не было, правяральшчыкі ўзяліся за мытнікаў. Знайшлі гарэлку і папрасілі мяне больш на працу не хадзіць. А чаму ніхто больш не ездзіў?*

*— Ды гэтыя дурні спалохаліся забабонаў. Сёння пятніца трынаццатага.*

*— Што ж ты мне раней не сказаў! Прыдурак! І я работу не згубіў бы, і ты захаваў бы сваю гарэлку ды суседа мытніка ў дадатак. У народныя прыкметы трэба верыць.*

**Сымон Нальшанскі**

# Спорт у бельскай „тройцы”




Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Гімназісты „тройкі” сталі нядаўна сярэбранымі медалістамі Ваяводскіх спаборніцтваў па гандболу (справа трэнер Васіль Ляшчынскі)*

Вучні Падставовай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім на працягу дзейнасці сваёй школы дабіваліся выдатных вынікаў у спорце. Станавіліся чэмпіёнамі Беластоцкага ваяводства на розных спаборніцтвах. Зараз у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім таксама ставяць на развіццё спорту. Дзякуючы намаганням настаўнікаў фізкультуры і працы вучняў становяцца яны пераможцамі ў Падляшскім ваяводстве. Нядаўна гандбалісты Бельскай белгімназіі, якіх трэнерам з'яўляецца дырэктар школы Васіль Ляшчынскі, сталі сярэбранымі прызёрамі ваяводскіх спаборніцтваў.

## *Сярэбраныя медалісты*

Матчамі, якія нядаўна праходзілі ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім, завяршыліся ваяводскія спаборніцтвы па гандболе. Бельскія белгімназісты выйгралі ў сваёй спартыўнай зале ўсе матчы з камандамі з Беластока і Сямятыч. Аднак выязны пройгрыш з вучнямі Гімназіі н-р 14 у Беластоку паўплываў на канчатковы вынік. Бельскія белгімназісты занялі другое месца ў Падляшскім ваяводстве.

— Амаль усё, чаго мы вучыліся ў час трэніровак, атрымлівалася ў час матчаў перад сваёй публікай. Толькі ў першай частцы ігры з сямятыцкай камандай, не ўсё атрымлівалася так, як мы хацелі. Пасля каманды, якія ігралі з нашымі хлопцамі, мусілі прыстасавацца да нашых прапаноў ігры, — тлумачыць трэнер гандбалістаў, дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Пасля спартыўных змаганняў была яшчэ надзея, што з другім месцам зможам ехаць на спаборніцтвы за кубак краіны. Аднак аказалася, што толькі адна каманда будзе выступаць ад імя нашага ваяводства.

Гандбалісты „тройкі” дабіваліся ўжо поспехаў з трэнерам Юркам Чыквіным, будучы вучнямі Падставовай школы. Два гады не займаліся актыўна гандболам і толькі з верасня гэтага школьнага года пачаліся іх інтэнсіўныя трэніроўкі і падрыхтоўка да спаборніцтваў. Вялікая спартыўная зала бельскай „тройкі” з'яўляецца толькі адной з некалькіх залаў у Бельскім і суседніх паветах, дзе можна праводзіць гандбольныя спаборніцтвы. Дырэктар Васіль Ляшчынскі хоча выкарыстаць гэты козыр у будучыні.

— Гандболам актыўна я пачаў займацца ў шасцідзесятыя гады, яшчэ будучы вучнем Педагагічнага ліцэя. Пасля іграў я ў гандбол будучы вучнем Настаўніцкага студыума ў Элку. З гандбалістамі пачаў я займацца, як трэнер, на першай маёй працы ў Падставовай школе ў Моры. У 1973 годзе мае вучні сталі чэмпіёнамі Гайнаўскага павета. У тых гадах у гандбол ігралі вучні ўсіх падставовых школ, — расказвае Васіль Ляшчынскі. — Апошнім часам у мяне многа часу і рашыў я выкарыстаць свае ўмеласці па гандболе.

## *Перамагалі ў спартыўных спаборніцтвах*

— У 1965 годзе не было добрых умоў, каб разгарнуць у школе спартыўную дзейнасць. Наша школа знаходзілася ў будынку Агульнаадукацыйнага ліцэя. Была там толькі невялікая спартыўная зала, якой нашы вучні маглі карыстацца толькі тады, калі дазволіла дырэкцыя ліцэя. Звычайна праводзілі мы заняткі на спартыўнай пляцоўцы побач школьнага будынка. Былі там умовы для трэніровак па гандболе, валейболе і баскетболе. Вучні займаліся там таксама лёгкай атлетыкай, якая побач гандбола была модным спортам, — успамінае дырэктар Васіль Ляшчынскі, які тады яшчэ працаваў па-за Бельскам-Падляшскім.

У невялікай зале ліцэя ў сямідзесятыя гады хлопцы з „тройкі” пачалі займацца баскетболам. Сталі яны чэмпіёнамі Беластоцкага ваяводства па баскетболе, а іх сяброўкі-баскетбалісткі дабіліся трэцяга месца ў ваяводстве.

— У сямідзесятыя гады добрым настаўнікам фізкультуры ў нашай школе быў Васіль Нікалаюк. Яго вучні станавіліся залатымі медалістамі Ваяводскай алімпіяды па лёгкай атлетыцы. У сямідзесятыя гады нашы дзяўчаты належалі да адной з лепшых у ваяводстве валейбольных каманд, а іх трэнерам быў Мікола Шымчук. Пасля найлепшыя нашы валейбалісткі, іграючы ў бельскай камандзе „Тур”, змагаліся за ўваход у II лігу, — кажа Васіль Ляшчынскі. — Каб школа дабівалася выдатных поспехаў у спорце, патрэбны таленавітыя вучні і вельмі салідная праца. Да перамогі нельга дайсці скарочанай дарогай. Калі гандбалістам трэба скакаць на кожнай трэніроўцы па 150 разоў на левай і правай назе, то яны павінны гэта рабіць.

Пачынаючы з 1990 года поспехі ў спартыўных спаборніцтвах заносяцца ў школьную хроніку, якую вядзе настаўнік фізкультуры Юрка Чыквін. Самых вялікіх поспехаў вучні Падставовай школы н-р 3 дабіваліся па лёгкай атлетыцы. Ужо ў 1989/1990 школьным годзе дзяўчаты і хлопцы занялі першыя месцы ў Беластоцкай алімпіядзе школьнай моладзі па лёгкай атлетыцы, а ў наступным годзе паўтарылі свой поспех. Пасля хлопцы яшчэ шэсць разоў станавіліся пераможцамі згаданай алімпіяды, а дзяўчаты найчасцей займалі другія месцы ў ваяводстве. Вучні „тройкі” ў 1994/1995 школьным годзе занялі трэцяе месца ў Спаборніцтвах школьнай моладзі Мазурска-Варшаўскай акругі па лёгкаатлетычным чатырохбор'і. У гэтым самым школьным годзе хлопцы перамаглі ў бегах наўпрасткі, арганізаваных у нашым ваяводстве. Хіба самым вялікім поспехам было чацвёртае месца ў Агульнапольскіх спаборніцтвах школьнай моладзі, якое занялі хлопцы ў 1991/1992 школьным годзе ў лёгкаатлетычным чатырохбор'і. Пасля ўзнікнення гімназій памяняліся названні спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы, але гімназісты бельскай „тройкі” надалей аставаліся ў ліку галоўных пераможцаў ваяводскіх змаганняў. Займалі першыя або другія месцы ў Падляшскай гімназіядзе па лёгкай атлетыцы. Белгімназісткі апынуліся на трэцім месцы ў гэтым спаборніцтве ў 1999/2000 школьным годзе. Іншым спортам, у якім вучні „тройкі” станавіліся пераможцамі, быў гандбол. У 2001/2002 школьным годзе хлопцы занялі першае месца ў Ваяводскіх спаборніцтвах па гандболе. У гэтым школьным годзе каманда малодшых гімназістаў Васіля Ляшчынскага (да другога класа гімназіі) заняла другое месца ў Гандбольных спаборніцтвах за кубак ваяводства. Зараз спартыўныя трэніроўкі ў школе вядуцца: Васіль Ляшчынскі, Уладзімір Баравік, Юрка Чыквін, Віктар Кудэрскі, Валеры Мешчэрыякоў, Уладзімір Васілюк, Генрыка Кудзін і Барбара Баравік.

— Зараз мы ў першую чаргу ставім у школе на трэніраванне дзяўчат і хлопцаў па лёгкай атлетыцы, гандболе і валейболе. Вельмі важна, каб настаўнікі фізкультуры, якія займаюцца пазакласнай трэніроўкай вучняў, самі ў маладосці былі добрымі спартсменамі. Яны лепш ад іншых настаўнікаў ведаюць, як вучняў узвесці на вышыню іх магчымасцей. Затое настаўнікі фізкультуры, якія будучы вучнямі не дабіваліся поспехаў у спорце, могуць быць вельмі добрымі педагогамі і ўмела працаваць з вучнямі ў час заняткаў па фізкультуры, — кажа дырэктар Васіль Ляшчынскі.

**Аляксей Мароз**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 824 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2005 r. upływa 5 czerwca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Рэгіянальны выраб

*— Хлопец з гітарай быў бы маёй парай! — падспеўвае мая Зося на кухні. З прытупам, бы Карын Станэк калісьці. Што, не памятаеце? То з якога вы пакалення будзеце? Не памятаеце тае чорнае шаліхвосткі, што, малога голасу будучы, ставіла на ногі ўсю брыдчэйшую палову грамадства і амаль цэлую рэшту? Незалежна ад узросту, адукацыі і маёмасці. Было, сплыло. А цяпер што там падспеўваць пра нейкага хлопца! Паслухаюць суседзі, скажуць, Зосьцы штосьці непрыстойнае ходзіць па галаве! Месіць цеста на пірог, гімячыць яго, валкуе, а падумаюць, што з качалкай на мне практыкуе!*

*— Што ты робіш?!*

*— Раблю свой уласны рэгіянальны выраб, — паведаміла мне мая палова. — Раблю яго ўжо значна больш чым чвэрць стагоддзя. Ведаюць яго ў ваколіцы, прынамсі сямейнай разам са шваграмі ды рознымі цёткамі. Варта было б крыху папрацаваць на славу нашага прозвішча. Ну, і, вядома, крыху зарабіць.*

*— Каб зарабіць, дык трэба прадаваць. То што, мо яшчэ і станеш са сваім вырабам на рынку?*

*— Не я, а ты станеш. Чаго вырачыўся! У сэнсе прамоцыі і маркетынгу, супакойся, Лукаш. Я ж з цябе і не думаю рабіць перакупшчыцы. Толькі што спачатку трэба даведацца, ці хтосьці маіх піражкоў не робіць ужо і не фірмуе ўласным прозвішчам. Тут без ліцэнзіі не абыдземся. Дарэчы, Лукашыку, у цябе там знаёмствы розныя. Распытай, што і як. А пакуль што, сядай за стол.*

*Я ніколі не супраць Зосіных спецыялаў, хоць, калі б шчыра налягаць на ўсё тое, што ёй час ад часу ўдаецца дзеля эксперыменту ды традыцыі змайстраваць, дык чалавек не ўлез бы ў тыповыя блёкавыя дзверы. Сеў я за піражкі „правасудкі", а тут як тут Вася Казадой. Вось дык нос ён мае, гэты Васька! Прытвараецца, што штосьці яму спатрэбілася, а зараз і за стол сядае. Не адмовіць жа ж яму Зоська, тым больш я!*

*— О, бачу, што вы наш рэгіянальны выраб ясце! — уцешыўся Вася. — Мая Анюта нарабілася, але пашанцавала! Я заняўся рэкламай, сын усе паперы з калегамі-студэнтамі панапісваў, аддрукаваў. Цяпер варта мець студэнта ў сям'і, нават на ўсю вёску такі прыдаецца. Еўропа!*

*— Якая Еўропа! Які рэгіянальны выраб! — пляснула мокрымі ад хваляванння далонямі Зося. — Гэта ж нашы правасудкі, піражкі з начынкай.*

*— З цыбулькай, мясам, курацінай, пячурыцамі? Гэтак як і ў нас. Але ад сёння ўжо яны называюцца „казадойкі".*

*— Цьфу! Начынялі б іх казіным сырам ці чым там яшчэ!*

*— А чым там яшчэ?! Можа, памётам?! Мне ўжо і есці самому адхацелася, і прапанаваць пачастунак суседу. А падумаць...*

*— А падумаць, яшчэ і пляшку хацелі паставіць з нагоды новага бізнесу! — Зося спрытна ўлавіла мае думкі.*

*— Ты чакай, чакай, Зоська, праўду кажа Лукаш! А мы і не падумалі з Анютай... Яшчэ і казіны сыр! Гэта ж для алергікаў, якім нельга піць каровіна малако! Ой, дзякуй вам! Якая ж экалогія! Ай-яй!*

*І Вася не глядзеў ужо лакома на нашы пахучыя правасудкі, і рынуўся ў дзверы, да сваё бізнесвумен.*

*— Гэта ж называецца... дрэнаж мазгоў! — залапатала Зоська.*

*— Не ўключай да сваіх піражкоў міжнароднай мафіі!*

*— Усё палітыка, усё! — уздыхнула мая жонка і зачарпнула апалонікам патройную порцыю свайго рэгіянальнага вырабу.*

*Лукаш Правасуд*

# Гэта не жарт




*Сённяшняя ўлада ў Беларусі і пашана да спадчыны*

## *Афарызмы Ладзіка Майніча*

Кнігі даюць для людзей занятак: адныя іх пішуць, другія чытаюць, трэція паляць.

*

Тэндэнцыя выхавання: лічыць у нас вучаць намнога хутчэй, чым чытаць.

*

У постсавецкіх афіцыянтаў і зараз афіцыёзныя твары.

*

Чалавеку ўласціва ня толькі памыляцца, але й адмаўляцца ад сваіх памылак.

*

Высокія шанцы ўзьляцець яшчэ не гарантуюць палёту.

*

Як мала ў нас газэт і як шмат галодных рэдактараў.

# Адгаданка



1. ранішні або начны лёгкі мароз вясной або восенню, 2. выражэнне весялосці, радасці, задаволенасці, 3. людаед, 4. вельмі тонкі крык, высокі гук, які напр. утварае мыш, 5. луста хлеба або пласт узаранай зямлі, 6. ядок, 7. тупая частка сякеры, 8. аб'ект пакланення язычнікаў, 9. збудаванне для пераезду цераз раку або планка, на якой замацоўваецца рад штучных зубоў, 10. натуральны падатак з народаў Паволжа, Сібіры і Далёкага Усходу, 11. звязаны пучок галінак для падмятання падлогі, 12. сябра ікса. (ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — застольнае выслоўе.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 16 нумара**

Ака, дзеяч, пята, сан, тыраж, чалма. Рашэнне: **Дзе араты плача, там жняя скача.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Марку Парэмбскаму** з Валіл-Станцыі.

# 29.05 – 04.06



**Баран (20.03. — 19.04.)** Цешся пагодлівым каханнем. Поспех цябе не пакіне, але не ў тых справах, на якіх табе найбольш залежыць. Свабодныя Бараны не павінны гуляць у каханне.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Можаш спадзявацца поспеху ва ўсім — таксама і нейкага немалога выйгрышу. Аднак у кантактах з блізкімі не старайся ваяваць, бо не сюдою дарога. Аб усім можна спакойна паразмаўляць.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** У любоўных іграх найважнейшая — стратэгія. Асаблівая бліскучасць думак. Нясмелы Блізнюк-мужчына схоча схавацца на бязлюднай выспе —з-за неспадзяваных поспехаў у кампаніі. Не заварачвай кіем рэчкі, калі нешта не ўдаецца ў сям'і.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Маеш шанц навучыцца чагосьці ад іншых. Мабілізавацца да ўвядзення ўсіх змен у жыцці, перад якімі найбольш баронішся. Ракам з 13 да 18 ліпеня будзе ўсё прыходзіць нялёгка.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Знакаміты канец мая і пачатак чэрвеня. Творчае выкарыстанне здабытых ведаў. Перад старымі знаёмымі не трымай таямніц.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Замест агню жарсцяў могуць выбухаць скандалы. Мусіш пагадзіцца з гэтым, што твой партнёр — не ідэал. Але таму кахаеш яго, што ён самы незвычайны, асаблівы. Не чакай манны з неба, закаці рукавы!

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Фартуна ўсё не забывае аб табе, трымае пад пазухай цікавую прапанову. Патрэба моцных пачуццяў, не цікавяць цябе летнія, малавыразныя сітуацыі і справы. Можна расчаравацца ў сябры. Не адкладвай візіту ў акуліста.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** На сужонскія адносіны пазітыўна паўплывае трыгон Плутона з планетоідам Юно. Калі трэба цяжкія размовы, правядзеш іх зусім безбалесна. 27-31.05. можаш ублытацца ў неадпаведнае знаёмства, асабліва ў інтарэсах.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Разблісніць твае таленты і ўмеласці. 27-31.05. можаш мець завялікую схільнасць на рызыку ў фінансавых справах. Трымайся здалёку ад „залатых" інтарэсаў.

**Казярог (22.12. 19.01.)** Дома будзеш хутчэй госцем, але гэта не паслабіць сувязяў. Ціхія дні ў сям'і гэта не развязка праблемы. Калі ты шэры працаўнік, твой праект зробіць уражанне.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Можаш клапаціцца, каб зарабіць на камфортныя канікулы. Крытыка сяброў. Цяжкая праца прынясе табе шмат задавальнення. Дбай аб пазваночнік і косці.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Ахопяць цябе рэфлексійныя настроі. Экскурсія вельмі ўдалая і павучальная. Знуднелае каханне можа ажыць пад уплывам... зайздрасці!

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960